ЗВЯРНУЦЦА ПА ДАПАМОГУ І АТРЫМАЦЬ

МС

ВІЦЕБСК – ГОРАД МАСТАКОЎ...

11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ЛЮТАГА 2024 г.
СЕРАДА
№ 36 (30170)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРАТКА

- **У 2023 годзе статус рэзідэнта СЭЗ атрымалі 30 новых кампаній.**
- БУТБ: біржавыя таргі спрашчаюць для суб'ектаў МСП пошук бізнес-партнёраў і зніжаюць рызыкі.
- **«АМКАДОР» абмеркаваў перспектывы супрацоўніцтва з Цюменскай вобласцю.**
- Маладзечна прымае X Форум маладых кампазітараў Беларусі і краін СНД.
- **Зборная Беларусі па пляжным футболе перамагла калумбійцаў на чэмпіянаце свету.**
- Дызайнеры-фіналісты «Млына моды» ўдзельнічаюць у міжнароднай выставе Collection Premier Moscow.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтрвыбаркама:

«Міжнародных назіральнікаў за выбарамі на сёння акрэдытавана 246. Вялікая група назіральнікаў ад краін СНД — як ад Выканкама СНД, так і ад парламенцкіх структур. Акрамя гэтага, ёсць міжнародныя назіральнікі ад Парламенцкай асамблеі АДКБ, ад Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Прадстаўлены цэнтральныя выбарчыя органы як краін СНД, так і іншых краін, напрыклад Пакістана. Сумесна з МЗС мы працуем па акрэдытацыі назіральнікаў — індывідуальных экспертаў з краін ЕС».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НЕ ПРОСТА РЭАЛЬНА АЦЭНЬВАЦЬ АБСТАНОЎКУ І РАЗУМЕЦЬ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА, АЛЕ І АПЕРАТЫЎНА ДЗЕЙНІЧАЦЬ»

Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад кіруючым саставам дзяржаўных органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі

На пачатку пашыранай нарады, якая адбылася ў Цэнтральным доме афіцэраў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сустрэча ў такім саставе з'яўляецца пэўным арыенцірам на будучыню, дазволіць сарыентаваць, у якім ключы праводзіць выніковыя калегіі сілавых структур. Найбольш вострыя пытанні ў сферы нацыянальнай бяспекі абмяркоўваліся адкрыта і па-мужчынску. На пашыранай нарадзе максімальна аб'ектыўна, без прыкрас ацанілі рэальную абстаноўку, якая складваецца ў Беларусі і вакол нашай краіны.

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што кожны на сваім узроўні ведае абстаноўку, але прапанаваў паглядзець на яе праз прызму экзістэнцыяльных пагроз, якія ўзніклі не сёння і не ўчора. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што мала іх бачыць. Трэба разумець глабальную палітычную кан'юнктуру, аб'ектыўна ацэньваць прычыны і перадумовы. Асабліва цяпер, калі свет зноў падышоў да краю прорвы.

СТАР. 2

Прагаласавалі — і ўвайшлі ў гісторыю

Учора ў Беларусі пачалося датэрміновае галасаванне на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і мясцовых Саветаў.

Навучэнцы другога і трэцяга курсаў Мінскага філіяла Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі Ірына НОВІКАВА, Ірына КРУГЛІК, Канстанцін СКІЦЁЎ, Арцём ВОЛКАЎ і Арына ПАРФЯНОВІЧ пасля сёлетніх выбараў увойдуць у гісторыю, бо выбарчая кампанія для маладых людзей — двойчы першая. Асабіста для іх — першая ў жыцці, а для краіны — першая з Адзіным днём галасавання.

На памяць аб гэтай падзеі дырэктар навучальнай установы Алег ЛЕЎШУНОЎ уручыў юнакам і дзяўчатам сувеніры і падарункавыя выданні Галоўнага закона краіны — Канстытуцыі.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Размова па сутнасці

«СТАРАЖЫТНАЯ. ТЫ САМАЯ СЛАВЯНСКАЯ...»?

Іншаземныя словы ў беларускай мове: на карысць ці на шкоду?

Пытальнік у загалоўку пасля вядомай цытаты з верша Пімена Панчанкі мы паставілі нездарма. Беларуская мова сапраўды лічыцца адной з самых блізкіх да старажытнай мовы ўсходніх славян, у яе сучасным варыянце і сёння нямала слоў, якія сустракаюцца ў старых летапісах (тое ж «вельмі», яго няма сёння ні ў рускай, ні ва ўкраінскай, і такіх прыкладаў, калі ставіць мэту, можна прывесці даволі шмат). Але хапае ў нашай мове і слоў чужых, запазычаных, якія ўжываюцца і дарэчы, і не дарэчы. Вядома, без многіх з іх ніяк не абыдзешся, але ж іншыя мову відавочна псуюць...

СТАР. 12-13

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«НЕ ПРОСТА РЭАЛЬНА АЦЭНЬВАЦЬ АБСТАНОЎКУ І РАЗУМЕЦЬ,

«Свет метадычна ператвараецца ў палігон глабальнага супрацьстаяння»

Беларускі лідар заўважыў, што няма на планеце краіны і народа, якія апошнія дзясяткі гадоў маглі б адчуваць сябе ў абсалютнай бяспецы. Ваенная сіла, па яго словах, ізноў стала галоўным аргументам сусветных цэнтраў вырашэння пытанняў. Як быццам і не было мільённых страт і жахаў Першай і Другой сусветных войн.

«Цяпер нас літаральна накрыла інфармацыйнай хваляй так званага прадчування трэцяй сусветнай вайны, аб якім толькі лянівы не сказаў, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — І паставы для асцярог ёсць».

Гарыць Блізкі Усход. Не больш спакойная сітуацыя і на еўрапейскім кантыненце, у тым ліку каля нашых граніц. Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ў непасрэднай блізкасці ад Беларусі і Расіі ў рамках аперацый Альянсу, якія праводзяцца ў Еўропе, размешчаны каля 32 тысяч вайскоўцаў аб'яднаных узброеных сіл НАТА і ЗША. «Гэта больш за тысячу адзінак бранятэхнікі, каля 160 артылерыйскіх сістэм і мінамётаў, 235 самалётаў і верталётаў, — канкрэтызаваў ён. — Усё гэта сведчыць як мінімум аб дэманстрацыі сілы. Аб тым, што мы фактычна знаходзімся ў эпіцэнтры найбуйнейшага ваенна-палітычнага крызісу, які зацягнуўся, з выкарыстаннем старых, як свет, метадаў запалохвання».

Па словах кіраўніка дзяржавы, прагнозы несуцяшальныя. Беларускі лідар папярэдзіў, што апетыты і актыўнасць калектыўнага Захаду будуць толькі нарастаць. «Вашынгтон і яго саюзнікі працягнуць пашыраць НАТА — сітуацыя для іх больш як спрыяльная, — дадаў ён. — ***Скажу прама, без лішняй дыпламатыі: амаль усе еўрапейскія лідары ператварыліся ў падданых Злучаных Штатаў Амерыкі.*** У тым, чыя палітыка, чые інтарэсы даміную на тэрыторыі Еўрасаюза, няма ніякіх сумненняў. Уступленне ў НАТА Фінляндыі, а вось-вось і Швецыі — гэта чарговы этап экспансіі на Усход. Будуць уцягваць у Альянс Боснію і Герцагавіну, Малдову, Грузію, Сербію. І ўсё гэта будзе па сцэнарыі Украіны».

«Цяпер з Украінай таксама гуляюць. Прывідная перспектыва членства ў блоку паспяхова выкарыстоўваецца заходнімі кураторамі для матывацыі і падштурхоўвання кіеўскай улады да працягу баявых дзеянняў. І нас хочуць усімі праўдамі і няпраўдамі ўцягнуць у гэтую вайну», — сказаў Прэзідэнт. Ён агучыў закрытую інфармацыю: «Мы дакладна ведаем, што думае наконт гэтага начальнік генеральнага штаба адной з вядучых краін — членаў НАТА: «Мы не змаглі ўцягнуць Беларусь у канфлікт. Актыўны ўдзел Мінска ў вайне падарваў бы рэжым у Беларусі і Лукашэнкі. Гэта магчымасць усё яшчэ адкрыта». І палякі падвіскваюць: «Вайна ва Украіне дае ім магчымасць змяніць беларускі рэжым». Нашым збеглым. Гэта цытата».

Па словах беларускага лідара, за гэтымі слоўнымі гульнямі стаіць жаданне нарэшце задаволіць свае застарэлыя тэрытарыяльныя амбіцыі. «Я ўжо пра гэта гаварыў, але паўтару яшчэ раз, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — ***Яны ў Еўропе лічаць, што (даслоўна) «па выніках гэтай вайны павінны адбыцца тэрытарыяльныя змены. Польшча мае законныя правы на частку сучаснай Беларусі. А «дэмакратычная Беларусь» у якасці кампенсацыі павінна атрымаць частку тэрыторыі пераможанай Расіі».*** Вось і ўся стратэгія. Закрытая нарада кіраўнікоў «ястрабаў». У гэтым іх стратэгія — нанесці глабальнае паражэнне Беларусі і Расіі, потым разабрацца і з тэрыторыямі, і іншым. Вы разумееце, які замес, якая бойня разгорнецца на гэтых землях».

«Толькі шматпалярны свет здольны ўсталяваць раўнавагу і гарантаваць бяспеку»

Асаблівасць цяперашняй фазы цывілізацыйнага супрацьстаяння Усход — Захад Прэзідэнт ахарактарызаваў так: маскі поўнасцю скінуты. «Калі раней для задавальнення сваіх геапалітычных амбіцый Вашынгтон хоць бы прыдумляў важкую падставу (усе памятаюць прабірку — Ірак), выкарыстоўваў мяккую і разумную, так бы мовіць, інспіраваў «каляровыя рэвалюцыі», гібрыдныя і проксі-войны па даверанасці, то сёння пераходзіць да адкрытай агрэсіі і фізічнага знішчэння непажаданых — без якіх-небудзь інфармацыйных прэлюдый», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Па словах беларускага лідара, цяпер нам скідаюць тэзіс аб тым, што шматпалярны свет — гэта свет некантраляванага росту агентаў хаосу, патрэбен адзін глабальны паліцэйскі (так пішуць вядучыя сродкі масавай інфармацыі Захаду). «Хлусня, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Так званы некантралюемы рост справакаваў і ўсё яшчэ спрабуе кантраляваць Вашынгтон. Гэта іх агонія. ***Толькі шматпалярны свет здольны ўсталяваць раўнавагу і гарантаваць бяспеку на ўсіх кантынентах. Пераход да яго вельмі стрэсавы і драматычны. А па-іншаму і не можа быць».***

«Мы проста абавязаны быць гатовы да адбіцця любых пагроз»

Кажучы аб граніцах нашай краіны і інтарэсах беларускага народа, Прэзідэнт задаў рытарычнае пытанне: якія ў заходнееўрапейскіх палітыкаў ёсць рэальныя прычыны пашыраць склад рознага кшталту кааліцый і ваенна-палітычнага альянсу? «Навошта гэтыя зусім абсурдныя неправавыя санкцыі, маштабная мілітарызацыя, дэманстрацыйная і дэманстратыўная гульня мускуламі, у тым ліку ваенная актыўнасць паблізу нашых граніц? — удакладніў ён. — Якія ў іх для гэтага падставы? Хто ім пагражае? І калі такое было ў гісторыі, каб мы камусьці пагражалі?» Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ўсе самыя крывавыя паходы ішлі з захаду на ўсход і з ганьбай адкочваліся ў адваротны бок, і падкрэсліў, што пры гэтым гінулі мільёны людзей.

«І нагоды што тады, што цяпер надуманыя: то вера ў нас не тая, то палітычная сістэма не адпавядае нейкаму стандарту, то чыесьці правы парушаюцца, — канстатаваў беларускі лідар. — ***Сапраўдныя прычыны інтарэсу да нашых земляў мы ведаем, але размова не пра тое. Нам вайна не патрэбная, таму мы павінны быць да яе гатовы і ментальна, і стратэгічна».***

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ўстаноўкі калектыўнага Захаду простыя да бязладдзя: тых, хто не з імі, будуць браць сілай. І няважна, ёсць на гэта падстава або не. ***«Аўтарытэт жа міжнародных арганізацый канчаткова дыскрэдытаваны,*** вазьміце Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, — канстатаваў ён. — Пляцоўкі некаторых з іх адкрыта выкарыстоўваюцца для абслугоўвання інтарэсаў канкрэтных краін. Ведаеце якіх. І Беларусь не ў іх ліку».

Прэзідэнт перакананы: план да немагчымасці прымітыўны. Ён павінен уключыць у сябе, акрамя Польшчы, Румыніі, Венгрыі і Славакіі, нейтральныя — Украіну і Беларусь. Пры ўмове, што Беларусь будзе «адрэзана» ад Расіі. Зразумела, афіцыйны Мінск разглядаецца як сатэліт Польшчы. «Вам гэта нічога не нагадвае?» — пацікавіўся ў прысутных беларускі лідар і падкрэсліў, што сёння вельмі важна не проста рэальна ацэньваць абстаноўку і разумець, што адбываецца, але і аператыўна дзейнічаць. Пры гэтым пастаўлена задача — дзейнічаць на апярэджанне.

«Мы ўсе, у першую чаргу людзі ў пагонах, проста абавязаны быць гатовы да адбіцця любых пагроз, — падкрэсліў Галоўнакамандуючы. — ***Памылкі пры гэтым недапушчальныя.*** Вы ж ведаеце, што хаваецца пад фармулёўкай маючых адбыцца вучэнняў узброеных сіл НАТА і ЗША «Абаронца-2024». Ведаеце, што значыць іх правядзенне на тэрыторыі краін Балтыі, Германіі і Польшчы для нас. Па атрыманых даных, каля 90 тысяч вайскоўцаў з 32 краін, членаў і партнёраў Альянсу, будуць стаяць на парозе нашага дома, адпрацоўваць стратэгію (цытата) «адбіцця спробы расійскай агрэсіі супраць адной з краін Альянсу». Як яны збіраюцца адбіваць агрэсію, мы ў курсе. Спецслужбы трымаюць сітуацыю на кантролі».

«Мы павінны быць гатовыя да новых трыгераў для дэстабілізацыі грамадства»

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што ўсе здабытыя разведкай сцэнарыі шматлікага роду правакацый, правядзення экстрэмісцкіх акцый з задзейнічаннем баевікоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Украіны, Польшчы і Літвы, беларускаму боку вядомыя і, наколькі гэта магчыма, неадкладна даводзяцца да агульнага ведама.

«Вось і цяпер падтрымаем гэтую традыцыю: яшчэ адна аператыўная інфармацыя, — падзяліўся эксклюзіўнымі звесткамі Аляксандр Лукашэнка. — Даслоўна цытую (гэта ўжо для палякаў важна): ***«Польская і амерыканская разведкі рыхтуюць буйнамаштабную правакацыю супраць цывільнага насельніцтва Польшчы, у якой абвінавацяць Расію і Беларусь». Разумееце, патрэбна нагода, завярушка. Усё старое як свет.*** Калісьці фашысты, Гітлер падрыхтавалі такую аперацыю на граніцы з Польшчай, каб справакаваць пачатак ваенных дзеянняў. Цяпер — гэтыя мярзотнікі. Ну добра, амерыканцы: ім усё роўна, што апошні ўкраінец або апошні паляк памрэ. Але як могуць палякі з амерыканцамі дамаўляцца аб такім сцэнарыі — гэта пытанне. Пасля гэтага пачнецца енк, што ў нас, што ў іх: «Ах, тут ён нагнятае сітуацыю, палохаючы палякаў, гэтага не можа быць». Слухайце, я сказаў, а вы рабіце высновы. Я кажу палякам і іншым. Пажывём — убачым. Але мы папярэдзілі па-братэрску польскі народ, каб былі акуратныя і асцярожныя».

Прывёў беларускі лідар і яшчэ адзін факт з даных разведкі: ***«Варшава спрабуе завербаваць высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў», якія змогуць замяніць нашых «ціхушак» і «лахушак».*** «Разумеюць: яны («ціхушкі» і «лахушкі». — «**Зв.**») не здольныя перавярнуць Беларусь, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Яны не здольныя рэалізаваць сцэнарый ужо не каляровай пэўнай рэвалюцыі і пэўнага марш-кідка сюды, у Беларусь. І не змогуць рэалізаваць узброенае ўварванне. Мы сочым за гэтым працэсам. Мы бачым іх падыходы да кіраўнікоў як у сферы ваеннай, так і цывільнай у Беларусі».

Прэзідэнт удакладніў, што яны будуць шукаць і ствараць новых лаяльных Захаду і больш эфектыўных дзеячаў у нашай краіне. Прычым, па словах кіраўніка дзяржавы, у ход пойдуць усе метады — ад банальных подкупу і шантажу да пагроз жыццю і здароўю.

«У фокусе ўвагі можа быць хто заўгодна, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — ***Усе павінны разумець рэальнае становішча і нашу дасведчанасць і тут, і там. Гэта прынцыповая пазіцыя. Тым больш цяпер, напярэдадні рознага роду палітычных падзей.*** У найбліжэйшы час пройдуць найважнейшыя для краіны мерапрыемствы: адзіны дзень галасавання, фарміраванне УНС. Нас зноў паспрабуюць расхістаць. Гэта відавочна. Схема не змянілася. Але мы павінны быць гатовыя да таго, што яны прыдумаюць новыя трыгеры для дэстабілізацыі грамадства».

«Не трэба жыць у ілюзіі абсалютнай перамогі»

Прэзідэнт агучыў ***тры асноўныя сцэнарыі дзеянняў збеглых і іх замежных кураторыў ад спецслужбаў у дачыненні да нашай краіны.***

«Першы, самы жаданы для іх. Гэта арганізацыя дзяржаўнага пераварота ці гвалтоўны захоп улады непасрэдна ў перыяд правядзення электаральных кампаній. Але пры гэтым самі ацэньваюць яго як малаверагодны. Асабліва ў перыяд Адзінага дня галасавання — гэта значыць, у гэтыя дні. Рэальных перадумоў для расхістання сітуацыі па аналогіі з 2020 годам яны пакуль не бачаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Другі, асноўны. Выкарыстанне бягучай выбарчай кампаніі ў якасці рэпетыцыі і пачатковага этапу падрыхтоўкі дзяржперавароту ў ходзе маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў у 2025 годзе. Менавіта на гэты сюжэт будуць кінуты ўсе асноўныя сілы і рэсурсы, актывацыя працэс пошуку новых пунктаў кіпення ў грамадстве, здольных справакаваць новую хвалю пратэсту», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён паўтарыў, што казаў раней: «За намі вельмі ўважліва сочаць і чакаюць, калі мы, улада, зробім памылку, каб яе максімальна выкарыстоўваць у сваіх мэтах. Вось гэтага нам дапусціць нельга».

І нарэшце, трэці сцэнарый збеглых — рэзервовы. «Гульня ў доўгую» — з шырокім задзеянічаннем інструментаў «мяккай сілы» на выпадак правалу першых двух варыянтаў развіцця падзей. Па сутнасці, гэтая гульня вялася, колькі існуе суверэнная Беларусь», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Па яго меркаванні, трэці сцэнарый рэальны, бо першы і другі ў нашай краіне не дапусцяць.

Беларускі лідар канстатаваў, што сёння асобныя інструменты гэтай «мяккай сілы» нейтралізаваны. Кардынальна перагледжаны падыходы да дзейнасці антыбеларускіх фондаў і нібыта праваабарончых арганізацый унутры краіны. Праведзена перарэгістрацыя партый. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што людзі ўбачылі антынацыянальную сутнасць так званых лідараў апазіцыі, якія жабруюць і поўзаюць у заходніх сталіцах. «У Беларусі яны па-за законам, але ўплываць на эмацыянальна ўразлівых людзей праз сацсеткі, месенджары, распрацоўваць новыя каналы сувязі і кіравання масамі спрабуюць і будуць спрабаваць, — папярэдзіў ён. — Да таго ж яны ўлічылі свае памылкі. І мы не павінны жыць у ілюзіі абсалютнай перамогі. Для збеглых поспех антыбеларускай кампаніі — пытанне выжывання. Радзіма прададзена, грошы заканчваюцца, а жыццё «ў еўропах» дарагое. Таму пойдуць на ўсё».

Што датычыцца глабальных гульцоў на палітычнай арэне, там, па словах беларускага лідара, стаўкі яшчэ вышэйшыя. ***«Справа нават не ў страчаных мільёнах, выдаткаваных на мяцежы, якія не атрымаліся,*** — удакладніў Прэзідэнт. — ***Гаворка ідзе аб рэпутацыйных стратах на ўзроўні міжнароднай палітыкі. Гегемону надакучыла ламаць зубы аб Беларусь, якую нават не кожны амерыканец знойдзе на карце свету».***

«Мы валодаем усім неабходным, каб гарантавана абараніць сябе»

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці зверыць гадзіннікі. Ён пацікавіўся, наколькі сілавы блок краіны гатовы да магчымых правакацый і нестандартных сітуацый у ходзе маючых адбыцца палітычных кампаній з улікам сітуацыі ў рэгіёне і ў свеце. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што моцныя бакі вядомыя, але больш важна паглядзець, дзе трэба дапрацаваць, дзе трэба ўзмацніцца, выходзячы з сучасных рэалій. Менавіта на гэтых пытаннях Прэзідэнт патрабаваў зрабіць акцэнт у сваіх дакладах ключавых міністраў сілавога блока. Галоўнакамандуючы арыентаваў быць максімальна гатовымі да нейтралізацыі рызык і пагроз. Для гэтага неабходна забяспечыць выразнае першачарговых задач.

Першая задача — узяць на асаблівы кантроль рэалізацыю сістэмных мер па павышэнні абараназдольнасці краіны, падтрыманні баявога патэнцыялу ўсіх суб'ектаў ваеннай арганізацыі дзяржавы. «Пры гэтым хачу папярэдзіць: шалёных грошай у краіны няма, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Усё, на чым нам трэба сканцэнтравацца, — гэта контрбатарэйная барацьба, беспілотнікі, РЭБ. І, самае галоўнае, я размаўляў з многімі генераламі, камандзірамі, хлопцамі-вагнераўцамі, якія адтуль прыйшлі, усё вырашаюць на полі бою ў сучаснай вайне ні ракеты і «калібры», пушчаныя з Чорнага мора і гэтак далей (гэта важна, але ў вайне так не пераможаш), а звычайны салдат са звычайнай стралковай зброяй: аўтаматамі, кулямётамі (пажадана добрымі, сучаснымі), гранатамётамі і іншай стралковай зброяй».

Не варта скідаць з рахунку і міны. Прэзідэнт расказаў, як у свой час яму прапаноўвалі іх знішчыць. Аднак кіраўнік дзяржавы не пагадзіўся. «У сучаснай вайне без мін немагчыма, — перакананы Галоўнакамандуючы. — Нягледзячы на высокатэхналагічнасць сучаснай вайны, вельмі важнымі застаюцца салдат і яго ўзбраенне, асабліва ў нашай лясіста-балотнай мясцовасці. Вельмі важныя апорныя пункты для супраціўлення».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што воінскія часці і падраздзяленні Дзяржпагранкамітэта і Узброеных Сіл упэўнена прыкрываюць нашы паўднёвыя і заходнія рубяжы. «Дзякуй хлопцам, якія сёння стаяць на граніцы: і пагранічнікі, і наша армія, — падкрэсліў Галоўнакамандуючы. — Вядома, у гэтай місіі вялікае значэнне мае маральная гатоўнасць ваеннаслужачых сілавога блока абараняць Радзіму. Ведаю, што ў дадзеным пытанні ў нас усё ў парадку, нават больш чым. У шэрагах Узброеных Сіл, не скажу аб грамадстве ў цэлым.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО АДБЫВАЕЦЦА, АЛЕ І АПЕРАТЫЎНА ДЗЕЙНІЧАЦЬ»

Ёсць гарачыя галовы, якія рвуцца хоць заўтра ў бой. А калі глядзець на сітуацыю ў Беларусі праз прызму гібрыднай вайны, мы ўжо даўно ваюем, як я не раз казаў, і робім усё, каб атрымаць перамогу без бітвы. Таму нарошчваем баявую магутнасць нашай арміі».

З мэтай умацавання абараназдольнасці скарэкціравана падрыхтоўка асабовага складу сілавых ведамстваў з улікам спецыфікі вядзення сучасных войнаў. Далі свае вынікі праведзеныя па даручэнні кіраўніка дзяржавы сумесныя заняткі з падраздзяленнямі Узброеных Сіл Расіі, ПВК «Вагнер». «Істэрыя ў заходніх СМІ толькі пацвердзіла своечасовасць і правільнасць гэтага рашэння, — канстатаваў беларускі лідар. — Мы вывучылі рэальны досвед вядзення бою. Яго неабходна аператыўна ўкараняць у паўсядзённую практыку і падрыхтоўку ўсіх ваеннаслужачых, але асабліва спецпадраздзяленняў».

Узмацняецца ваенна-тэхнічны патэнцыял Беларусі. У строй пастаўлены найноўшыя ўзоры беларускага РСЗА «Паланэз-М» далёкасцю да 300 кіламетраў. На ўзбраенне паступілі два зенітныя ракетныя дывізіёны С-400 і два дывізіёны ракетных комплексаў «Іскандэр-М». Прэзідэнт адзначыў, што пастаўка новых узораў тэхнікі будзе працягнута.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што на тэрыторыі краіны размешчана расійская тактычная ядзерная зброя. «Сёння гэта найважнейшы элемент стрымлівання любога праціўніка, — падкрэсліў ён. — ***Мы валодаем усім неабходным, каб гарантавана абараніць сябе і, як кажуць вайскоўцы, нанесці праціўніку непрымальную шкоду. У гэтым сутнасць нашай стратэгіі».***

Праведзеныя праверкі баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці войскаў пацвердзілі здольнасць злучэнняў часцей выканаць задачы па прызначэнні. І надалей гэтаму пытанню будзе ўдзяляцца першарадная ўвага. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў, што мы ўпершыню ў гісторыі краіны адмабілізавалі цэлую механізаваную брыгаду Заходняга аператыўнага камандавання. «Таксама правялі шэраг праверак падраздзяленняў сіл неадкладнага рэагавання, — адзначыў ён. — Пры гэтым змадэлявалі рэальныя ўмовы эскалацыі канфлікту. Як мне паведамляюць, з задачай у цэлым справіліся».

Разам з тым, як канстатаваў беларускі лідар, выяўлены недапрацоўкі ў якасці падрыхтоўкі войскаў і, у першую чаргу, у прафесійнай падрыхтоўцы афіцэраў. Пэўныя праблемы ёсць з падтрыманнем у спраўным стане тэхнікі і ўзбраення, утрыманнем запасаў ракет, боепрыпасаў і іншых матэрыяльных сродкаў. Не абыходзіцца без недахопаў і ў планаванні і прымяненні сіл неадкладнага рэагавання, нясенні баявога дзяжурства па супрацьпаветранай абароне. Праводзіцца адпаведная работа па ўстараненні гэтых недахопаў.

«Паважаныя мужыкі, я буду рабіць усё, як Прэзідэнт, для таго, каб вы ў тыле мелі менш праблем», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ваеннаслужачыя будуць знаходзіцца ў прыярытэце ў вырашэнні жыллёвага пытання. «Мы вырашым вашу праблему на працягу двух-трох найбліжэйшых гадоў, — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка. — Але не гэта галоўнае. Я міністра заўсёды папярэджваю: звярніце асаблівую ўвагу на тэхніку і ўзбраенне, боепрыпасы. Якая вайна, якое супраціўленне, калі танк не можа даехаць да палігона або нейкая іншая браніраваная машына? Гэта галоўнае. І мы гэтаму кірунку ўдзялялі і будзем удзяляць самую сур'ёзную ўвагу. Трэба гэта зрабіць, мужыкі. Трэба трымаць у цэласнасці і захаванасці зброю».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што для людзей у пагонах у прынцыпе недапушчальныя фармалізм і разгільдзяйства. ***«Павінны быць жалезная дысцыпліна і найвышэйшая прафесійная вывучка,*** — канкрэтызаваў ён. — Тут таксама ёсць пытанні. Без усвядомленага стаўлення да службы, без разумення сур'ёзнасці моманту ўсе нашы дзеянні асуджаны на правал. І ніякія сучасныя ўзбраенні і тэхналогіі не дапамогуць. Работа з людзьмі павінна быць на першым месцы. Маральны стан і дух кожнага афіцэра, які перадаецца байцам, — найважнейшы элемент».

Галоўнакамандуючы паставіў Міністэрству абароны задачу на наступны год — якаснае пераўтварэнне арміі і ўдасканаленне сістэмы абароны краіны. Даручана ўдзяліць прыярытэтную ўвагу баявой падрыхтоўцы воінскіх часцей і падраздзяленняў. Тым больш што ва Узброеных Сілах 2024 год з'яўляецца Годам палявой вывучкі.

«Урокі сучаснай вайны мы вывучылі на прыкладзе Украіны, і, павінен сказаць, мы зрабілі адпаведныя высновы, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка і паставіў задачу звярнуць асаблівую ўвагу на пытанне супрацьдзеяння беспілотным лятальным апаратам. — Сёлета першарадную ўвагу я буду ўдзяляць гэтаму, бо змагацца з беспілотнікамі, выходзіць з ружжом, або з ружжом рэбаўскім, або «Асой» і, яшчэ горш, «С-400» — гэта страляць па вераб'ях з гарматы. Усе гэтыя сістэмы кіруюцца праз электроніку. Мы ж вялікія, мы ж гэта ўмеем рабіць, гэта ж наша тэма. Таму мы павінны навучыцца падаўляць беспілотнікі. Ужо, я гляджу па ўкраінскай вайне, тэрмін з'явіўся — «рой беспілотнікаў». І запускаюць іх сотні на аб'екты, з вельмі небяспечнымі мінамі і снарадамі, якія знішчаюць масу людзей. Збіць іх практычна немагчыма. Таму РЭБ (радыёэлектронная барацьба. — **«Зв.»**) і яшчэ раз РЭБ».

Прэзідэнт паставіў задачу засяродзіць увагу на фізічнай, агнявой і тактычнай падрыхтоўцы ваеннаслужачых, пры гэтым трэба сысці ад нікому не патрэбнай «мушткі». «Катэгарычна папярэджваю: ад гэтага трэба сыходзіць. Мы кампактная краіна, у нас не служаць хлопцы з Далёкага Усходу, дзесьці заслужылі — трэба і ў адпачынак адпусціць», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння кожны, хто стаіць на абароне дзяржавы або будзе прызваны пад ружжо, павінен дакладна разумець, як яму дзейнічаць, якія задачы ён выконвае. Гэта датычыцца ўсіх, у тым ліку тэрытарыяльнай абароны і народнага апалчэння. Фарміраванні створаны, праведзена сур'ёзная работа па ўдасканаленні заканадаўства. «Мы ўсе разумеем, што для дасягнення пастаўленай мэты толькі законаў недастаткова, — перакананы Прэзідэнт. — Сістэма падрыхтоўкі і арганізацыі народнага апалчэння на практыцы павінна працаваць як гадзіннік. Неабходна ўлічыць ужо вядомы досвед — украінскі сцэнарый, калі на руках у насельніцтва бескантрольна гуляе зброя. Гэты сцэнарый не для нас, ён недапушчальны».

Разам з тым, як лічыць кіраўнік дзяржавы, на сітуацыю ва Украіне мы ў прынцыпе павінны глядзець як на ўрок, пастаянна ўдасканальваючы падрыхтоўку артылерыстаў, адточваючы метады вядзення контрбатарэйнай барацьбы, мадэрнізуючы сродкі радыёэлектроннай разведкі. «І давайце шчыра: у дачыненні да беспілотнай авіяцыі, дронаў-камікадзэ, маштабнага абсталявання імі арміі, падрыхтоўкі аператараў дронаў мы ўжо адсталём, — канстатаваў беларускі лідар. — А зрабіць трэба было яшчэ ўчора. Таму неабходна наганяць упушчанае. І не толькі Мінабароны, але і МУС, Дзяржпагранкамітэту. Савету бяспекі трэба ўзяць гэтае пытанне на кантроль і працягнуць праверкі якасці падрыхтоўкі асабовага складу сілавых ведамстваў у гэтым годзе».

«Праспаць любы сігнал, правакацыю — смерці падобна»

Яшчэ адна задача — непрыступнасць нашых рубяжоў. «Для аховы граніцы прыцягнуты не толькі пагранічнікі, але і іншыя сілавыя органы, — яшчэ раз паўтарыў Прэзідэнт. — Гэта сіметрычны адказ на нарошчванне пагранічнай інфраструктуры з боку сумежных краін, тэхнічныя магчымасці якой выходзяць далёка за рамкі заяўленых мэт. Аб глабальных прычынах і пагрозах сказана. Усе спадарожныя задуме суседзяў правакацыі, уключаючы незаконнае выцясненне ў Беларусь бежанцаў з тэрыторый Польшчы, Літвы і Латвіі (выкідванне іх проста праз граніцу, часам трупаў), закрыццё шэрагу пунктаў пропуску, штучныя абмежаванні транзіту грузаў, мы ацэньваем адэкватна і рэагуем».

Аднак, як падкрэсліў Галоўнакамандуючы, да чаго рыхтуюцца па той бок граніцы — сёння не галоўнае пытанне. ***«Значна важней разумець, ці гатовы мы быць на крок наперадзе ў любым задуманым для нас сцэнарыі,*** — канкрэтызаваў ён. — ***Гэтае пытанне нацыянальнай бяспекі, абароны нашых нацыянальных інтарэсаў.*** А ўсё пачынаецца з граніцы. Праспаць любы сігнал, правакацыю — для нас смерці падобна».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што зацверджаны рашэнні па ахове дзяржаўнай граніцы, а таму патрабуе іх няўхільнага выканання. Па яго словах, з улікам беспрэцэдэнтна блізкага да нас размяшчэння ваеннага кантынгенту НАТА і праведзення маштабных вучэнняў Альянсу ўзаемадзеянне органаў пагранічнай службы з Узброенымі Сіламі павінна быць арганізавана на найвышэйшым узроўні. Пры неабходнасці пастаўлена задача падключаць іншыя ведамствы.

«Усё павінна працаваць дакладна, дзеянні давесці да аўтаматызму»

Трэцяя задача — павысіць эфектыўнасць дзяржаўнай сістэмы рэагавання на акты тэрарызму з боку тэрарыстычных арганізацый і незаконных узброеных фарміраванняў. «Праведзеныя па маім даручэнні праверкі паказалі: КДБ як каардынатар у гэтай сферы ў цэлым гатовы арганізаваць работу сілавога блока ў выпадку закіду ў нашу краіну баевікоў і здзяйснення тэрактаў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Але на тактычным узроўні сладжанасць дзеянняў прыдадзеных падраздзяленняў усё яшчэ далёкая ад дасканаласці».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што матывацыя і гатоўнасць асабовага складу спецпадраздзяленняў сілавых ведамстваў да выканання задач па спыненні актаў тэрарызму высокая. «Але прафесійна павінны быць падрыхтаваны ўсе: не толькі спецпадраздзяленні, — удакладніў ён. — Варта дапрацаваць алгарытмы дзеянняў суб'ектаў сістэмы рэагавання на акты тэрарызму і экстрэмізму, працягнуць далейшае баявое сладжванне і якасную баявую падрыхтоўку ўсіх, хто ўдзельнічае ў гэтай дзейнасці».

Прэзідэнт нагадаў, што сёння з-за мяжы асобныя прыхільнікі «перамен» заяўляюць аб намеры зайсці ў Беларусь для яе «вызвалення». «Захапіць хаця б які-небудзь раённы цэнтр (накшталт Маларыты або Кобрына), аб'явіць там «незалежную Беларусь» і адсюль пачынаць дзейнічаць, — патлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Ім трэба легалізавацца ў Беларусі хаця б на квадратным метры, і вырашаць яны гэту праблему будуць сілавым шляхам. Адзін метад застаўся — узброеная барацьба, на гэта даюць грошы. Рыхтуюць харугвы, палкі, як яны іх называюць, і гэтак далей. Мэта — як мінімум захапіць кавалак зямлі і аб'явіць сябе дзеючай уладай».

Па словах Прэзідэнта, нашы збеглыя і іх куратары ад спецслужбаў вядуць мэтанакіраваны пошук і вярбоўку асоб, якія могуць здзейсніць тэракты і дыверсіі. Фактаў хапае. «Гэта добра, што тэрарысты ўстаноўлены і затрыманы, — падкрэсліў беларускі лідар. — Але паўстае пытанне: калі ў нас граніца на замку, то як гэтыя баявікі змаглі даставіць сродкі паражэння і арганізаваць схроны? Гэтую праблему я бачу. Пытанне патрабуе дэталёвага аналізу для недапушчэння падобных выпадкаў далей».

У сувязі з гэтым кіраўніком дзяржавы даручана праверыць сістэмы аховы аб'ектаў сілавых ведамстваў Міністэрства абароны, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, КДБ, МУС, грамадзянскай крытычнай інфраструктуры. Створаная антыдыверсійная сістэма дазваляе забяспечыць абарону аб'ектаў. Камітэту дзяржбяспекі даручана працягнуць удасканаленне сістэмы рэагавання на акты тэрарызму. ***«Усё павінна працаваць дакладна, усе дзеянні давесці да аўтаматызму»,*** — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Каб захаваць адзінства нашых людзей

Чацвёртая задача — забеспячэнне найвышэйшага ўзроўню кібербяспекі краіны. Прэзідэнт канстатаваў, што кібератакі — гэта біч сучаснага лічбавага грамадства. Аднак зроблена нямала для абароны даных крытычнай інфармацыйнай інфраструктуры. Кіраўніком дзяржавы падпісаны адпаведны Указ («Аб кібербяспецы»), у якім замацаваны асноўныя кірункі стварэння нацыянальнай сістэмы забеспячэння кібербяспекі. Аператыўна-аналітычным цэнтрам у гэтым годзе ўпершыню праведзена трэніроўка з сіламі забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

«Чакаю даклада ад вынікаў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але ўжо цяпер можна казаць, што праблемныя пытанні ёсць. Нягледзячы на меры, якія прымаюцца, працягваюцца ўзломы дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў. Так, метады ўвесь час удасканальваюцца, абсалютную абарону ад кібератак не гарантуе ні адна сістэма абароны. Але мы павінны мінімізаваць рызыкі. Асабліва ў востры перыяд. І рэагаваць трэба».

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў інфармацыйны ўкід аб нібыта наяўным запасе вакцын ад каранавіруса для кіраўніка дзяржавы ў час пандэміі. Прэзідэнт звярнуў увагу, што рознага кшталту інфармацыйныя ўкіды і кібератакі будуць працягвацца, а таму іх нельга пакідаць без увагі. ***«Пастаянна будуць падбухторваць нашых людзей, улазіць у іх мазгі,*** — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — ***Трэба ўмець на гэта рэагаваць. Мы гэта ўмеем рабіць. Нешта робім, але пакуль слаба».***

Беларускі лідар парэкамендаваў не перабольшваць ролю электронных СМІ. ***«Жывое слова ў зносінах з людзьмі было і ёсць галоўным інструментам для таго, каб захаваць маналіт і адзінства нашых людзей»***, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Каб за сухой справаздачнасцю не было паламаных лёсаў людзей

Наступная задача, якая адносіцца да ўсіх праваахоўных органаў, у першую чаргу МУС і МНС, — людзі павінны адчуваць сябе ў бяспеці дома, на працы, на вуліцы ў любы час сутак.

Кажучы аб зніжэнні злачыннасці, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паказчыкі ўвогуле нядрэнныя. Зменшылася колькасць асабліва цяжкіх і менш цяжкіх супрацьпраўных дзеянняў. Разам з тым адзначаюцца і негатыўныя тэндэнцыі. Расце колькасць махлярстваў, вымагальніцтваў і кіберзлачынстваў. ***«Тут важна, каб за сухой справаздачнасцю не заставалася нявырашаных пытанняў, паламаных лёсаў людзей,*** — звярнуў увагу беларускі лідар. — Я ўжо даў адпаведнае даручэнне па ўдасканаленні норм крымінальнага заканадаўства. Трэба аператыўна правесці гэту работу».

Як Прэзідэнту дакладваюць, прыняты дадатковыя меры па аператыўным раскрыцці злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці. «Сёння гэта найважнейшы аспект падтрымання правапарадку, спынення дзеянняў адмарозкаў, а таксама прафілактыка тых, хто збочыў, хто яшчэ не да канца разумее, на што іх нацэльваюць замежныя куратары», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў, што ўзровень злачыннасці — гэта своеасаблівы зрэз праблем грамадства (як відавочных, так і латэнтных), індыкатар рэальных выклікаў і пагроз нацыянальнай бяспецы. «Проста выяўляць і спыняць іх недастаткова, — патрабуе кіраўнік дзяржавы. — ***Павінна быць зваротная сувязь паміж усімі суб'ектамі барацьбы з супрацьпраўнымі дзеяннямі і грамадствам. І абсалютна недапушчальна, каб самі супрацоўнікі праваахоўных органаў парушалі закон».***

Кажучы аб абароненасці насельніцтва ад стыхійных бедстваў, Прэзідэнт пацвердзіў, што колькасць пажараў і колькасць загінулых на іх зменшылася. Але, па яго словах, варта імкнуцца да нулявых паказчыкаў. «Гінуць і дзеці, што патрабуе прынцыповых мер па прадухіленні такіх трагедый», — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка і адзначыў, што за кожную смерць трэба адказваць.

Таксама ён звярнуў увагу на тое, што не да канца вырашана пытанне абсталявання інтэрнатаў, аб'ектаў з масавым знаходжаннем людзей сістэмамі аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі і апавяшчэння аб пажары. «Што гэта, праблема? Ці хтосьці не хоча гэтым займацца? Толькі давайце без перабору, каб заўтра эканоміка не спынілася», — арыентаваў кіраўнік дзяржавы.

Рэзюмуючы, Прэзідэнт падкрэсліў, што глядзіць на работу сілавога блока комплексна і дастаткова крытычна, нават прыдзірліва. «Час такі, кожная памылка можа вельмі дорага нам абысціся, — патлумачыў ён. — Цана — мір і бяспека людзей».

Вераніка КАНЮТА.

(Працяг тэмы на 4 стар.)

Асноўная мэта — захаваць мір і сацыяльна-палітычную стабільнасць

Аб чым гаварылі кіраўнікі сілавых ведамстваў на нарадзе з Прэзідэнтам

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ паведаміў, што за мінулыя тры гады ў дзейнасці суб'ектаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі адбыліся сур'ёзныя змяненні. «Кіраўніцтва і асабовы склад усіх без выключэння ведамстваў сілавога блока зрабілі работу над памылкамі, — удакладніў ён. — Па-новаму паглядзелі на свае задачы і магчымасці, ацанілі існуючыя сілы і сродкі, а галоўнае — вызначылі, на што звярнуць першачарговую ўвагу».

Дзяржсакратар падкрэсліў, што ў плане развіцця сістэмы гарантавання нацыянальнай бяспекі 2023 год стаў пікавым. «Мы падышлі да пэўнай мяжы, калі назапашаныя веды, вопыт і навыкі неабходна прымяніць на практыцы, — звярнуў увагу Аляксандр Вальфовіч. — І зрабіць гэта трэба максімальна эфектыўна. На аснове комплекснага аналізу інфармацыі, усебаковай ацэнкі вынікаў, праведзеных па рашэнні Прэзідэнта нашай краіны праверак, можна зрабіць асноўныя высновы: усе сілавыя органы здольны і гатовы ў сучасных умовах забяспечыць выкананне задач. Галоўнае, нягледзячы на нагнятанне істэрыі вакол Беларусі, — у краіне ўдалося захаваць мір і сацыяльна-палітычную стабільнасць».

Фота БелТА

Генеральны пракурор Андрэй ШВЕД далажыў аб стане законнасці і правапарадку, перш за ўсё ў дзейнасці суб'ектаў сістэмы нацыянальнай бяспекі. «Нягледзячы на пэўныя паляпшэнні крымінагеннай сітуацыі, абстаноўка, якая складваецца, патрабуе ад праваахоўных органаў сістэмнай ацэнкі сітуацыі і аператыўнага рэагавання, — падкрэсліў ён. — Галоўнай задачай у тым ліку з'яўляецца захаванне стабільнасці правапарадку, папярэджанне экстрэмізму і яго крайняй формы — тэрарызму. Нягледзячы на некаторае зніжэнне колькасці экстрэмісцкіх злачынстваў, іх сыход у інфармацыйную прастору, трэба быць гатовымі да яшчэ большай радыкалізацыі дэструктыўных сіл».

Па словах генпракурора, асноўнымі задачамі павінны стаць выяўленне, папярэджанне дзейнасці непажаданых груп уплыву, цэнтраў канцэнтрацыі матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў, супрацьдзеянне ўцягненню супрацоўнікаў праваахоўных органаў у дэструктыўную дзейнасць. «Не менш значную пагрозу для дзяржавы ўяўляюць карупцыя і эканамічная злачыннасць, — дадаў Андрэй Швед. — Кіраўнік дзяржавы неаднаразова адзначаў, што залог захавання правапарадку — гэта, у першую чаргу, стабільная работа і развіццё эканомікі. Таму такая важная работа па ўзмацненні барацьбы з карупцыяй, крадзяжамі, ухіленнем ад выплаты падаткаў як на кожным канкрэтным прадпрыемстве, так і ў цэлым у сферах эканомікі. Рэзервы для гэтага, па нашым меркаванні, маюцца».

Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ агучыў фактары, якія фарміруюць пагрозы нацыянальнай бяспецы, і задачы, якія стаяць перад КДБ. Ён адзначыў, што дакументальныя матэрыялы аб намерах Захаду рэгулярна дакладваюцца кіраўніку дзяржавы. «Адзначаецца беспрэцэдэнтнае нарошчванне вытворчасці ўзбраення, тэхнікі і боепрыпасаў у вядучых краінах Захаду, — заўважыў кіраўнік ведамства. — На тэрыторыі Польшчы і прыбалтыйскіх дзяржаў рэалізоўваюцца маштабныя праграмы па абсталяванні будучага тэатра ваенных дзеянняў. Ажыццяўляецца рамонт дарог і аэрадромаў для хуткай перакідкі груп з Германіі і іншых краін НАТА ў прыгранічныя з Беларуссю раёны Польшчы, Літвы і Латвіі. Узброеныя сілы Польшчы праводзяць маштабную рэарганізацыю групоўкі войскаў на беларускім напрамку, у Літве і Латвіі на закрытых рэжымных тэрыторыях ажыццяўляецца пабудова аб'ектаў інфраструктуры для размяшчэння воінскіх падраздзяленняў краін НАТА».

Па словах старшыні КДБ, фіксуецца беспрэцэдэнтны ўзровень усіх відаў разведкі супраць Рэспублікі Беларусь. «Практычна штодзень у рэжыме анлайн ажыццяўляюцца здымкі сродкамі касмічнай разведкі месцаў дыслакацыі асабовага складу сілавых структур, баз захоўвання ўзбраення і ваеннай тэхнікі, аэрадромаў, чыгуначных пуцей, — канкрэтызаваў ён. — Толькі за 2022—2023 гады контрразведкай камітэта выяўлена 114 спроб вярбоўкі нашых грамадзян, у тым ліку 37 ваеннаслужачых. Да крымінальнай адказнасці прыцягнута 45 чалавек, якія сталі на шлях здрады. За шпіёнскую дзейнасць затрымана 16 замежных грамадзян».

Кіраўнік ведамства расказаў і аб тым, што Дзярждэпартаментам і спецслужбамі ЗША распрацавана і рэалізоўваецца пры ўдзеле іншых заходніх дзяржаў доўгатэрміновая стратэгія па дэстабілізацыі сітуацыі ў Беларусі з задзейнічаннем дэструктыўных элементаў, якія аселі на тэрыторыі Польшчы, Літвы, Украіны, Чэхіі, некаторых іншых дзяржаў. «Праводзіцца работа па іх кансалідацыі, нягледзячы на існуючыя супярэчнасці і ўнутраную барацьбу за фінансы, — дадаў Іван Тэртэль. — Плануецца фарміраванне квазіпарламента, псеўдавыбары ў які назначаны на 25 мая, а таксама іншых дэструктыўных протаструктур, якія, па задуме амерыканцаў, дадуць магчымасць захаваць патэнцыял для будучых дзеянняў супраць».

Як адзначыў у сваім дакладзе **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**, работа Міністэрства ўнутраных спраў арганізавана выходзячы з аналізу аператыўнай абстаноўкі і патрабаванняў кіраўніка дзяржавы да арганізацыі службовай дзейнасці. «Павялічаная ў мінулым годзе колькасць заяў і паведамленняў, якія паступілі, сведчыць аб узрослым узроўні даверу грамадзян да міліцыі, у тым ліку і па пытаннях, якія не адносяцца да дзейнасці МУС», — заўважыў ён.

Асобна кіраўнік міліцэйскага ведамства спыніўся на нарказлачыннасці. Ён паведаміў: у 2023 годзе канфіскавана больш як тона наркотыкаў, што амаль у шэсць разоў больш, чым у 2022-м. «Гэта вынік планамернай работы па перакрыцці каналаў пастаўкі наркотыкаў і спецыялізаваных інтэрнэт-магазінаў, — удакладніў ён. — Не выключаю, што дадзеныя пастаўкі маюць на мэце ў тым ліку дэстабілізацыю абстаноўкі напярэдадні выбарчай кампаніі».

МУС актыўна вядзе работу па прафілактыцы супрацьпраўных паводзін падлеткаў і абароне непаўналетніх. «Не менш важным пытаннем, якое патрабуе рэагавання і далейшых рашэнняў, з'яўляецца педафілія, — падкрэсліў Іван Кубракоў. — Усе выпадкі педафіліі раскрыты. У рабоце па абароне дзяцей адной з задач МУС з'яўляецца каардынацыя дзейнасці дзяржорганаў».

Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Канстанцін МОЛАСТАЎ расказаў аб абстаноўцы на Дзяржаўнай граніцы і ў пагранічнай прасторы. «Пагранічныя ведамствы сумежных дзяржаў працягваюць ахову дзяржаўнай граніцы ва ўзмоцненым рэжыме пагранічнай службы з прыцягненнем падраздзяленняў паліцыі і ўзброеных сіл, — далажыў ён. — У цэлым, у 2024 годзе адзначаецца зніжэнне міграцыйнай актыўнасці на ўсіх участках граніцы з сумежнымі краінамі Еўрасаюза, і ў першую чаргу на граніцы з Польшчай, дзе ў 2023 годзе польскі бок рабіў шматлікія спробы выправаджэння мігрантаў на нашу тэрыторыю, у асноўным на ўчастках пагранічных застаў Брэсцкай пагранічнай групы белавежскага напрамку».

Старшыня Дзяржпагранкамітэта звярнуў увагу, што ў бягучым годзе, на граніцы з сумежнымі краінамі Еўрасаюза, адзначаецца істотны рост інтэнсіўнасці прымянення пілатаванай і беспілотнай авіяцыі. «Актыўнае выкарыстанне авіяцыі паблізу граніцы спалучана з магчымымі парушэннямі дзяржаўнай граніцы ў паветранай прасторы, — патлумачыў ён. — Найбольш яскравым прыкладам з'яўляецца факт парушэння граніцы ў паветранай прасторы ў верасні 2023 года на ўчастку Гродзенскай пагрангрупы верталётам Мі-24 узброеных сіл Польшчы».

З боку сумежнай Украіны граніца абсталявана мінна-выбухнымі загародамі, асноўная шчыльнасць якіх засяроджана ў раёнах пунктаў пропуску, масты і чыгункі на асноўных шляхах зносін знішчаны, у тым ліку шляхам падрыву. «Гэтыя работы ўкраінскі бок працягвае і ў бягучым годзе, у асобных выпадках робячы тое дэманстратыўна, — дадаў Канстанцін Моластаў. — Актыўна праводзяцца мерапрыемствы баявой падрыхтоўкі на палігонах насупраць участкаў Гомельскай пагрангрупы, Мазырскага пагранатрада. У параўнанні з 2023 годам, сёлета адзначаецца захаванне правакацыйных рызык на граніцы з боку ўкраінскіх узброеных фарміраванняў. У 2024 годзе намі зафіксаваны тры факты дробных правакацый. Захоўваецца актыўнасць вядзення разведкі нашай прыгранічнай тэрыторыі з інтэнсіўным прымяненнем тэхнічных сродкаў».

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН паведаміў, што на 2024 год ведамствам вызначана шэсць асноўных задач. «Па-першае, не дапусціць зніжэння дасягнутага ўзроўню баявой гатоўнасці войскаў, — канкрэтызаваў ён. — Па-другое, у поўнай меры і якасна рэалізаваць запланаваны комплекс мерапрыемстваў будаўніцтва Узброеных Сіл. Па-трэцяе, дабіцца павышэння рэзультатыўнасці мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, у першую чаргу тых, якія праводзяцца на мясцовасці. Чацвёртая задача — павысіць узровень укамплектаванасці ваеннымі кадрамі. Пятай задачай лічу падтрыманне станоўчай дынамікі ў пытаннях воінскай дысцыпліны. І шостая задача — недапушчэнне зніжэння ўзроўню спраўнасці тэхнікі і павышэнне ўкамплектаванасці войскаў новымі і мадэрнізаванымі ўзорамі ўзбраення».

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ВУП Ізраіля абваліўся амаль на 20 працэнтаў

Валавы ўнутраны прадукт краіны ў апошнім квартале мінулага года ўпаў на 19,7 працэнта ў параўнанні з папярэднімі трыма месяцамі 2023-га. Пра гэта сведчаць даныя справаздачы ізраільскага Цэнтральнага статыстычнага бюро (ЦСБ), якое адзначыла, што такія вынікі звязаны з «пачаткам вайны 7 кастрычніка», паведаміла ТАСС. За апошнія тры месяцы мінулага года ізраільцяне скарацілі выдаткі на асабістае спажыванне на 26,9 %, паказчыкі экспарту ўпалі на 18,3 %, імпарт скараціўся на 42 %, падзенне інвестыцый склала 67,8 %, у тым ліку рынак нерухомасці, адзначаецца ў дакументе. Пры гэтым дзяржаўныя выдаткі, у асноўным на вайсковыя патрэбы і кампенсацыйныя выплаты пацярпелым ад ваенных дзеянняў, падскочылі на 88,1 %, паведамілі ў статбюро.

Фінскія вайскоўцы пачалі масава звальняцца

Выданне Helsingin Sanomat паведаміла, што ў Фінляндыі вайскоўцы пачалі масава звальняцца. Пра гэта інфармуе РІА «Новости». У артыкуле фінскага выдання сказана, што ў лютым колькасць сіл абароны, якія звальняюцца з рэзерву, павялічылася настолькі, што ўсім ахвотным не хапае месцаў, каб завяршыць навучанне. У матэрыяле ўдакладняецца, што той, хто звольніўся з рэзерву, абавязаны прайсці дадатковую падрыхтоўку, якая складаецца з пяці дзён, па грамадзянскай службе. Паведамляецца, што ў 2024 годзе з рэзерву звольніліся ўжо 1435 чалавек, прычым 1,2 тысячы з іх — толькі ў лютым. Пры гэтым тых, хто звольніўся ў мінулым годзе, было 1650. Раней міністр абароны Фінляндыі Анці Хекенен заявіў, што плануе знайсці такія прававыя сродкі, якія дазволяць прадухіліць выхад людзей з ліку рэзервістаў.

З пачатку зімы ў Манголіі загінула больш за 610 тысяч галоў жывёлы

Пра гэта паведамілі мясцовыя СМІ, спасылаючыся на даныя Галоўнага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях краіны, перадае «Сіньхуа». «Страты былі звязаны з суровымі зімовымі ўмовамі надвор'я ў краіне, вядомымі як белы дзуд, або зімовая бяскорміца жывёлы», — адзначана ў афіцыйным паведамленні. Пры гэтым у мангольскіх аймаках Архангай, Хэнцій, Сухбаатар, Дарнод і Дарнагоў зарэгістраваны самыя высокія паказчыкі гібелі жывёлы. Белы дзуд з'яўляецца стыхійным бедствам у жывёлагадоўлі рэгіёнах, у першую чаргу ў Манголіі, пры якім хатняя жывёла нездольная знайсці корм пад снегам, у выніку чаго вялікая колькасць жывёлы гіне ад голаду і холаду. Цяпер жывёлагадоўля застаецца адной з асноўных галін эканомікі Манголіі, а таксама крыніцай даходу для амаль 40 працэнтаў качавога насельніцтва краіны.

Дзейныя асобы

ЖЫЦЬ СУМЛЕННА І ПАМЯТАЦЬ...

Такім быў наказ ветэрана

Імя лётчыка-штурмавіка П. С. Старавойтава раней было мала вядомым, нават у адмысловай кнізе «Памяць. Гродна» пра героя — хіба ўпамінанне...
Супрацоўнікам нашай цэнтральнай гарадской бібліятэкі шмат чаго ўдалося вярнуць з забыцця.

Нарадзіўся Піліп Сцяпанавіч у 1905 годзе ў вёсцы Блізняцы (сёння гэта Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці), скончыў сем класаў і прафесійную школу, удзельнічаў у трох войнах: Грамадзянскай у Іспаніі, Савецка-фінскай і Вялікай Айчыннай... У 1933 годзе скончыў Адэскую школу пілотаў і пасля гэтага ўжо сам быў прызначаны камандзірам лётнай вучэльні ў горадзе Карасцень, якую ў першыя ж дні вайны эвакуіраваў у Свярдлоўск...

Адтуль — з просьбай адправіць на фронт — Піліп Сцяпанавіч звяртаўся асабіста да Сталіна: пісаў, што кадравы афіцэр, што мае вялікі вопыт, што не можа змірыцца з тым, што гінуць маладыя, неспрактыкаваныя хлопцы.

З ліпеня 1943-га маёр Старавойтаў — на франтах Вялікай Айчыннай, пасля стажыроўкі з лістапада гэтага ж года — камандзір 62-га штурмавога авіяцыйнага палка, які да лютага 1944-га здзейсніў 714 паспяховых вылетаў, у выніку чаго было знішчана і выведзена са строю 30 танкаў, 444 аўтамашыны, 128 гармат супрацьпаветранай абароны, 150 гармат зенітнай артылерыі і зенітных гармат, 65 мінамётаў, 80 чыгуначных вагонаў, каля 800 салдат і афіцэраў праціўніка, разбурана 20 бліндажоў, восем перапраў, запалена і падарвана чатыры склады з гаручым і боепрыпасамі.

У адным з баёў самалёт Старавойтава быў падбіты, ахоплены полымем, аднак Піліпу Сцяпанавічу ўдалося прызямліцца — спланіраваць на сваю тэрыторыю, сесці бліз станцыі Лёзна. З кабіны яго, непрытомнага камандзіра, выцягнуў стралок-радыст.

На іх шчасце, непадалёк быў медсанбат...

Пасля аказання дапамогі Старавойтаў адчуў сябе больш-менш нармальна і папрасіў адправіць яго на найбліжэйшы аэрадром, а ўжо адтуль (яшчэ раз адмовіўшыся ад шпіталізацыі) — у свой полк.

Лётчыкі, якія бачылі, што самалёт камандзіра збілі, ну, вядома ж, не чакалі убачыць яго жывым: сустракаць збяглася ўсе...

І гэта — не адзін вось такі выпадак: падчас вайны Піліп Сцяпанавіч некалькі разоў быў паранены, па стане здароўя яго хацелі камісаваць, але ён вярнуўся ў строй і Перамогу сустрэў у званні палкоўніка, намесніка камандзіра 233-й штурмавой авіяцыйнай дывізіі.

Пра Старавойтава ў сваіх ваенных успамінах «Над полем бою» двойчы Герой Савецкага Саюза (пасля — маршал авіяцыі) Яфімаў пісаў: «Лётчыкі і паветраныя стралкі, інжынерна-тэхнічны склад любілі свайго камандзіра... за адвагу і прастату. Ён заўсёды першым лятаў на баявыя заданні і хутка арыентаваўся ў становішчы... Часам ён рабіў па два, а то і па тры вылеты.... Камандзір у авіяцыі — найлепшы лётчык і найлепшы баец. Такім быў Старавойтаў, вакол якога заўсёды гуртавалася моладзь».

Піліп Сцяпанавіч узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Суворава III ступені, Чырвонай Зоркі і іншымі, васьмю медалямі.

...Напрыканцы жыцця перамяшчаўся на мыліцах, быў інвалідам I групы. Памёр у 1977 годзе.

У музеі воінскай славы СШ № 11 ёсць экспазіцыя, прысвечаная 62-му Гродзенскаму штурмавому авіяпалку. Там жа захоўваюцца асабістыя рэчы камандзіра, Ганаровага грамадзяніна горада — яго ваенны кіцель з ордэнскай планкай, фуражка, лётны шлем, кішэнны даведнік штурмана, медыцынская картка, кіёк, на які абапіраўся ў старасці... Іх перадалі музею дочкі героя.

У асабістым архіве пісьменніка Юрыя Бедзіка захоўваюцца здымкі. На адным з іх — дароўны надпіс: «Юра, памятай старога, будзь заўсёды сумленным. Ад ветэрана вайны Старавойтава. 26.12.76 г.».

Інэса Ілюшына,
г. Гродна.

Ёсць пытанне

КАМУ ЗАСТАНЕЦЦА СПАДЧЫНА?

«Мы з мужам — людзі немаладыя, маем двух сыноў, чатырох унукаў... Хацелі б скласці завяшчанне. Растлумачце, калі ласка, як гэта правільна зрабіць?»
Алена Мікалаеўна, Бабруйскі раён.

Завяшчаннем прызнаецца волевыяўленне грамадзяніна па распараджэнні маёмасцю, якая яму належыць, на выпадак смерці. Гэта аднабаковая здзелка, якая ажыццяўляецца толькі асабіста і ўступае ў сілу толькі пасля смерці завяшчальніка.

Завяшчанне можа здзейсніць грамадзянін, які валодае дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме (то-бок дасягнуў паўналецця). Для гэтага неабходна звярнуцца ў натарыяльную кантору або ў натарыяльнае бюро да любога натарыуса, незалежна ад свайго месца жыхарства. Пры сабе неабходна мець дакумент, які сведчыць асобу, пры наяўнасці права на льготу па аплаце натарыяльнага тарыфу — дакумент, які сведчыць такое права (пенсіённае пасведчанне, пасведчанне інваліда I або II групы). Пры гэтым дакументы, якія пацвярджаюць права на маёмасць, не запатрабоўваюцца, паколькі завяшчаць можна не толькі тую маёмасць, якая ўжо належыць завяшчальніку, але і маёмасць, якая будзе набытай.

Пры складанні завяшчання грамадзянін не абмежаваны ў колькасці спадчыннікаў і мае права, паводле свайго меркавання, завяшчаць маёмасць любым асобам, якія і ўваходзяць, і не ўваходзяць у кола спадчыннікаў па законе, падназначыць спадчынніка, пазбавіць спадчыны аднаго, некалькіх або ўсіх спадчыннікаў па законе, а таксама ўключыць у завяшчанне іншыя распараджэнні, якія не супярэчаць заканадаўству.

Варта адзначыць, што, калі завяшчальнік ніяк не змяняе прадугледжаны законам парадак атрымання спадчыны (то-бок усю сваю маёмасць завяшчае спадчыннікам па законе ў роўных далях), у складанні завяшчання мэтазгоднасці няма.

Тэкст завяшчання павінен дакладна перадаваць волю завяшчальніка, быць выразным і зразумелым, не дапускаюцца выразы, якія змяшчаюць супярэчнасці і розныя тлумачэнні. Невыкананне правіл аб пісьмовай форме завяшчання і яго сведчанні цягне несапраўднасць завяшчання. Натарыяльна засведчанае завяшчанне павінна быць напісана завяшчальнікам уласнаручна ў двух экзэмплярах альбо запісана з яго слоў натарыусам у прысутнасці сведкі (у такім выпадку ён павінен мець пры сабе дакумент, які сведчыць асобу).

Грамадзянскім заканадаўствам вызначаны асобы, якія не могуць быць сведкамі: натарыус або іншая асоба, якая сведчыць завяшчанне; асоба, на карысць якой складзена завяшчанне або зроблена завяшчальная адмова, муж (жонка) такой асобы, яе дзеці, бацькі, унукі і праўнукі; спадчыннікі па завяшчанні або па законе; грамадзяне, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю; непісьменныя; асобы, якія маюць судзімасць за дачу лжывых паказанняў; грамадзяне з фізічнымі недахопамі, якія не дазваляюць ім у поўнай меры ўсвядоміць сутнасць таго, што адбываецца; асобы, якія не валодаюць у дастатковай ступені мовай (за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам).

Падчас складання завяшчання таксама неабходна памятаць, што свабода завяшчання абмяжоўваецца правіламі аб абавязковай долі ў спадчыне, аб недапушчэнні ўскладання на асоб, назначаных спадчыннікамі ў завяшчанні, абавязку ў сваю чаргу пэўным чынам распарадзіцца завешчанай маёмасцю на выпадак іх смерці, а таксама ўключэння ў завяшчанне супрацьпраўных або невыканальных для спадчынніка з-за аб'ектыўных прычын умоў яго паводзін для атрымання спадчыны.

Дзеючае заканадаўства не абмяжоўвае колькасць завяшчанняў, якія можа скласці грамадзянін, не абмяжоўвае завяшчальніка і ў праве валодання, карыстання і распараджэння завешчанай маёмасцю пры жыцці. Завяшчальнік мае права ў любы час, без тлумачэння прычын, адмяніць зробленае ім завяшчанне ў цэлым альбо змяніць яго, склаўшы новае. Аднак для гэтага таксама неабходна звярнуцца да натарыуса (то-бок немагчыма адмяніць завяшчанне, проста перакрэсліўшы ці парваўшы свой экзэмпляр).

Неабходна адзначыць, што завяшчанне — гэта эфектыўны інструмент, з дапамогай якога завяшчальнік можа змяніць прадугледжаны законам парадак атрымання спадчыны, даючы завяшчальніку магчымасць рэалізаваць правамоцтва па распараджэнні сваёй маёмасцю на выпадак смерці, зыходзячы з волевыяўлення.

Наталля ЖУКАВА,
натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі.

Даты

РАМАН, ЯКІ ТРЭБА ПЕРАЧЫТВАЦЬ

Сёлета, 3 ліпеня, мы будзем святкаваць 80-годдзе вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта, як мне здаецца, добрая нагода ўспомніць самім і дзецям расказаць пра падзеі тых часоў: жыццё сталіцы пад акупацыяй, Мінскае падполле, подзвігі людзей, якія наблізалі дзень, калі горад змог свабодна ўздыхнуць, распачаць сваё аднаўленне і абнаўленне.

У гэтай сувязі я хачу згадаць раман Івана Мележа «Мінскі напрамак». У ім народны пісьменнік Беларусі здолеў расказаць пра гераічнае і трагічнае ў нашай гісторыі, уславіць подзвіг народа.

Вельмі спадзяюся, што ў многіх бібліятэках (у тым ліку хатніх) ёсць гэты твор (а добра было б, каб з'явіўся яшчэ і мастацкі фільм!), што многім зараз захочацца прачытаць ці яшчэ раз перачытаць яго. На маю думку, для нас, нашчадкаў славутых дзядоў і бацькоў, гэта стала б яркім прыкладам таго, якімі прынцыпамі трэба кіравацца, каб захаваць мір.

Вадзім Мохаў,
г. Мінск.

Усмешачку

«Ой, бяжыць, бяжыць дарога, Кліча вёску ў выхадны...»

«Здаўна чытаю «родную газету на роднай мове», здаўна што-нішто пішу, — у першых радках свайго ліста паведамляе спадар Іван Астроўскі з Мінска. — Мае прыпеўкі друкаваліся ў рубрыцы «На прызбе ў Алёны», але ж гэта было даўно... З тых часоў з'явілася безліч новых. Дасылаю толькі «жменьку» — на пачатак новай вясны і чарговага дачнага сезона.

Невялічкая прыпеўка —
Але ж сілы ў яе...
Хоць прыпеўка не гарэлка,
А настрою прыдае.

* * *

На базары ўсё чужое,
А на лецішчы — сваё.
Любім дачу мы за тое,
Што працуем і пяём.

* * *

Каб быў трактар ці канёк,
Бульбу б тачкай не валок,
Пад лапату не садзіў
І гарбатым не хадзіў.

* * *

На палях ужо даўно
Не валяецца яно,
Пакуль трактар заарэ, —
Дачнік шуфлем падбярэ.

* * *

Ой, бяжыць, бяжыць дарога,
Кліча вёска ў выхадны.
Цешча лічыць — на падмогу.
Зяць мяркуе — на бліны.

* * *

Не дапетру, як тут быць,
Сталі ўсе мяне прасіць:
Жонка з цешчай —
штось зрабіць,
Цесць са шваграм — піва піць.

* * *

Наліваў сусед мне з чвэрці —
Думаў я — канец прыйшоў:
Сабіраўся ўжо памерці,
Але выручыў расол!

* * *

Не чакаем дапамогі
Мы, старэнькія грыбы.
Калі воўка кормяць ногі,
Нас — нажытыя гарбы.

* * *

Збудаваў сабе я дачу
Аж у чорта на рагах.
І жыцця за ёй не бачу,
І ўжо кінуць — аніяк.

Усім здароўя і добрых ураджаяў!

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Сморгонский агрегатный завод», Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, д. 27, УНП 500232200
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов –
материалы, бывшие в употреблении (одним лотом)

Старогодние железнодорожные рельсы
в составе **– шпальная решетка** №№ 1, 2, 3, 4 (12,5 м), **шпальная решетка** № 5 (15 м), **железобетонные шпалы** – 6 шт., **тупиковый железнодорожный рельсовый упор** – 1 шт.
Составные части и их количество размещены на сайте организатора аукциона (cpo.by) и ЭТП (ipmtorgi.by).
Местонахождение: Гродненская область, Сморгонский район, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, д. 2, 32

Начальная цена лота с НДС 20 % – 39 180,00 бел. руб.
(снижена на 3 %)

Размер шага составляет 5 (пять) процентов от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 7 (семь) рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов 6 % от итоговой цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.12.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 11.00 05.03.2024. Окончание торгов: 12.00 05.03.2024.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.03.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

СП «Промекс» ООО,
извещает о проведении торгов по продаже имущества –
МАШИНО-МЕСТА № 196
(инв. № 500/D-798201896),
расположенного по адресу:
г. Минск, ул. Радищева, дом 3

Торги будут проведены **21 марта 2024 года в 10.00** по адресу: **г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, оф. 316.**

Организатором торгов является ликвидатор СП «Промекс» ООО – Лапатин Юрий Геннадьевич.

Заявки на участие в торгах принимаются до 15.00 15 марта 2024 г. Прием заявок и документов на участие в торгах, а также ознакомление с характеристиками имущества и его стоимостью осуществляет организатор торгов – Лапатин Юрий Геннадьевич – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 17.00 по адресу: 220053, г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, оф. 316, тел. +375-33-363-71-27.

Общая начальная цена имущества 6 666 руб .

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в размере 1 % от стоимости имущества, на приобретение которого претендует заявитель, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет СП «Промекс» ООО, р/с BY87BLBB30120100349659001006 в ЦБУ № 537 г. Минск ОАО «Белинвестбанк», код BLBBBY2X, УНП100349659.

Шаг торгов составляет 1 % от начальной цены предмета торгов.

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

УНП100349659

Уважаемые акционеры
ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»!

29 марта 2024 года в 11.00
СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»
по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал)

Повестка дня годового общего собрания акционеров:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год и основных направлениях развития Общества на 2024 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2023 году.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год.
4. О результатах аудита финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2023 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2023 год. О выплате дивидендов за 2023 год.
6. Утверждение порядка использования и распределения прибыли на 2024 год и I квартал 2025 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2024 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета.
8. Избрание членов ревизионной комиссии.
9. О вознаграждении членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. Об утверждении локальных правовых актов Общества.

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 15 марта 2024 г.

С материалами по вопросам повестки для собрания лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 в следующем порядке:

- с 07.03.2024 по 28.03.2024 в рабочие дни с 9.00 до 16.40 по месту нахождения Общества (каб. 304А), в день проведения собрания – с 9.00 до 10.30 по месту его проведения (актовый зал) – с информацией о деятельности Общества за 2023 год и основных направлениях деятельности на 2024 год;
- с 22.03.2024 по 28.03.2024 в рабочие дни с 9.00 до 16.40 по месту нахождения Общества, в день проведения собрания – с 9.00 до 10.30 по месту его проведения – с иными материалами по вопросам повестки дня годового общего собрания акционеров.

Регистрация участников собрания будет осуществляться **29 марта 2024 г. с 10.00 до 10.45** по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»

УНП 100258980

ОАО «Гранд Фэшен Хаус»
26 марта 2024 года в 10.00
ПРОВОДИТ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Брест ул. Куйбышева, 13А/2-9, кабинет 9-3

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год и основные направления деятельности Общества в 2024 году.
2. Отчет совета директоров Общества.
3. Отчет ревизионной комиссии Общества.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2023 год.
5. О выплате дивидендов и утверждении распределения прибыли Общества за 2023 г.
6. Утверждение основных направлений использования чистой прибыли Общества в 2024 году и 1 квартале 2025 года.
7. Избрание членов совета директоров Общества.
8. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
9. О размере вознаграждения членам совета директоров и ревизионной комиссии Общества.
10. Об утверждении решений совета директоров Общества.

Местонахождение ОАО «Гранд Фэшен Хаус»: г. Брест ул. Куйбышева, 13А /2-9, кабинет 9-6.

Место проведения собрания: г. Брест ул. Куйбышева, 13А/2-9, кабинет 9-3.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13А/2-9, кабинет 9-3 с 19 марта 2024 г. по 25 марта 2024 года с 10.00 до 15.00 в рабочие дни либо 26 марта 2024 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания проводится с 09.30 до 09.50 в день и по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 14 марта 2024 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Совет директоров Общества.

УНП 290671335

29.03.2024 г. в 12.00 состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2023 год и основных направлениях деятельности общества в 2024 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества за 2023 г.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2023 г.
4. Об утверждении распределения прибыли общества по итогам работы за 2023 г., о выплате дивидендов за 2023 г.
5. Об утверждении основных направлений использования прибыли в 2024 году и первом квартале 2025 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра – 20.02.2024 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 04.03.2024 г. (с 14.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «Гипросвязь»
СООБЩАЕМ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 28 марта 2024 года по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, конференц-зал

Регистрация участников – с 9.00 до 9.40
Начало проведения собрания: 10.00

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Гипросвязь» за 2023 год.
2. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Гипросвязь» за 2023 год с учетом аудиторского заключения и заключения ревизионной комиссии.
3. О распределении чистой прибыли, оставшейся в распоряжении ОАО «Гипросвязь» за 2023 год, объявлении и выплате дивидендов по результатам 2023 года.
4. О направлении использования чистой прибыли ОАО «Гипросвязь» на 2024 год.
5. Об избрании членов наблюдательного совета ОАО «Гипросвязь».
6. Об избрании членов ревизионной комиссии ОАО «Гипросвязь».
7. Об определении размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О приобретении ОАО «Гипросвязь» акций собственного выпуска с целью последующей безвозмездной передачи государству в количестве, пропорционально заявленным требованиям.
9. Об определении регламента работы наблюдательного совета в соответствии с частью двенадцатой статьи 51 Закона Республики Беларусь от 09.12.1992 № 220-XII «О хозяйственных обществах».
10. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

Время и место ознакомления акционеров со следующей информацией:

о деятельности ОАО «Гипросвязь» за отчетный год – с 7 по 27 марта 2024 года по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00;

с материалами по вопросам повестки дня собрания акционеров – с 7 по 27 марта 2024 года по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

- акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера – документ, удостоверяющий личность и оригинал доверенности, который должен быть передан лицу, определенному директором ОАО «Гипросвязь» для выполнения этих функций.

Список акционеров ОАО «Гипросвязь», имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 27 февраля 2024 года.

Наблюдательный совет

УНП 100230534

Организатор торгов – частное предприятие «ПАКУМ» извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица –
ООО «Лестракинвест»

Аукцион состоится **02.04.2024 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Смолячкова, 9, каб. 426

№ лота	Наименование лота	Начальная цена лота с НДС 20 %, руб.	Шаг торгов 5 %, руб.	Задаток 1 %, руб.
6	**Водогрейный котел KOMKONT CH120;** мощность 1,2 МВт; год выпуска 2018; новый; полный комплект	204 000,00	10 200,00	2 040,00

Продавец	ООО «Лестракинвест», +375291307853
Организатор торгов	Частное предприятие «ПАКУМ», г. Минск, ул. Смолячкова, 9-426, тел. +375293321936
Реквизиты для оплаты задатка	Частное предприятие «ПАКУМ», УНП 191274798, р/с BY58BPSB30121044660169330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, БИК BPSBBY2X

Заявки на участие в торгах принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в срок до 15.00 01.04.2024 г.
Подробная информация о составе лота на сайте pakum.by.
Осмотр лота в рабочие дни с 9.00 до 15.00, тел. +375291307853.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения и определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте организатора аукциона – https://pakum.by

21 марта 2024 года в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров
ОАО «НеоТрейдЗапад»
по адресу: г. Гродно, ул. Гаспадарчая, 8, тел. (80-152) 558998

С повесткой дня собрания акционеры могут ознакомиться с 01 марта 2024 г. с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно ул. Гаспадарчая, 8, каб. 205.

Перечень вопросов по повестке дня общего годового собрания акционеров утвержден Протоколом наблюдательного совета № 8 от 01.02.2024.

В ПОВЕСТКЕ ДНЯ РАССМОТРЕНИЕ ВСЕХ ОСНОВНЫХ ВОПРОСОВ ПО ИТОГАМ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОБЩЕСТВА ЗА 2023 ГОД.

Формирование списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания будет составлен по состоянию на 01.03.2024 г.

Закрытие реестра акционеров – 01.03.2024 г.

УНН 500167057

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
21 лютага 2024 г. № 7 (740)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ

Наталля КАЧАНАВА:

«У НАС ЦУДОЎНАЯ МОЛАДЗЬ»

Аб чым Старшыня Савета Рэспублікі гаварыла са студэнтамі БДУ

Фота БелТА.

ПРЫЯРЫТЭТЫ дзяржаўнай палітыкі і міжнароднае становішча, асаблівасці заканадаўчай дзейнасці і работы верхняй палаты Парламента, электаральная кампанія і роля моладзі ў ёй, інфармацыйная гігіена і адказнасць за будучыню краіны — вось тыя асноўныя тэмы, што абмяркоўваліся на сустрэчы. Акрамя іх, было яшчэ многа абмеркаванняў, цікавых пытанняў і шчырых адказаў на іх.

Пачалася сустрэча традыцыйна — з расказу Наталлі Качанавай аб тым, чым жыве краіна сёння, якія мэты і задачы наперадзе, што зроблена і што патрабуе ўвагі ў будучым. Аднак была і адна акалічнасць — у аўдыторыі былі выключна студэнты. Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла: «Я папрасіла, каб сёння тут прысутнічалі толькі студэнты, без выкладчыкаў, без рэктара. Я папрасіла прабачэння, канешне, маўляў, разумею, што пажадана, каб былі і кіраўнікі, але... Чаму так? Таму што я проста хачу з вамі пагаварыць. Я зараз давяду да вас інфармацыю, якой хацела б падзяліцца, а потым вы мне задасце любыя пытанні, якія вам будуць цікавымі. Асабістага плану, наконт развіцця нашай краіны, канкрэтна маёй працы — усё, што вам цікава».

«Работа над законапраектамі цікавая, не сухая»

Менавіта так ахарактарызавала Старшыня Савета Рэспублікі заканадаўчую дзейнасць. Яна адзначыла, што Савет Рэспублікі — палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і горада Мінска на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых саветаў выбіраюцца па восем членаў Савета Рэспублікі, яшчэ восем — прызначаюцца Прэзідэнтам. На сёння ў склад верхняй палаты Парламента ўваходзяць 58 чалавек, якія займаюцца заканатворчай дзейнасцю і не толькі.

У Беларусі каля 2,3 тысячы дзеючых законаў, з іх прыкладна палова — аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў, далучэнні да дакументаў міжнародных арганізацый. Апошнім часам асноўная работа вялася па прывядзенні дзеючага заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Наталля Качанава адзначыла, што план гэтай работы выкананы на 100 %, неабходныя змяненні ўнесены ў 86 законаў, а таксама былі прыняты два абсалютна новыя: «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці».

Спікер падкрэсліла, што работа гэтая надзвычай сур'ёзная, часта патрабуе далучэння вузкіх спецыялістаў. Каб усе заканадаўчыя акты і нарматыўныя прававыя акты былі дакладнымі і выверанымі, у Савеце Рэспублікі дзейнічае экспертны савет. За час яго работы разгледжана 252 дакументы, з якіх без заўваг было падтрымана толькі каля 30 %, што сведчыць аб дасканалай і скрупулёзнай рабоце спецыялістаў савета.

Звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі і на важнасць работы з людзьмі. «Гэта важная і значная частка нашай дзейнасці. Дзякуючы сустрэчам з моладдзю, з працоўнымі калектывамі, асабістым прыёмам і тэлефонным лініям мы бачым і чуем, што хвалюе людзей, на што трэба звярнуць увагу ў першую чаргу. Такім чынам удакладняюцца і карэкціруюцца планы нашай работы», — адзначыла яна. Акрамя таго, карысць такіх сустрэч яшчэ і ў тым, што людзі непасрэдна ад дзеючых палітыкаў атрымліваюць вычарпальную інфармацыю аб дзейнасці органаў улады, прыярытэтах развіцця краіны. І, што немалаважна, інфармацыю дакладную, аб'ектыўную і праўдзівую. У адносінах жа да фэйкаў аб нашай краіне, якія распаўсюджваюцца ў сеціве, Наталля Качанава зазначыла, што не трэба бяздумна паглынаць інфармацыю, тым больш з сумнеўных сайтаў ці тэлеграм-каналаў: «...Адкрытая хлусня ў адносінах да людзей, краіны, падзей — вядома, гэта бяда. І вам у такім патоку інфармацыі, канешне, трэба для сябе дакладна разумець: што правільна, дзе прыярытэты расставіць у гэтым жыцці, што трэба зрабіць сёння, каб заўтра жыць у міры і спакоі».

Лёсавызначальны этап у жыцці краіны

«Мы ўвайшлі ў палітычна важны этап у жыцці нашай краіны — ідзе электаральная кампанія... І ўсе, хто мае права браць удзел у выбарчай кампаніі, будуць аддаваць свой голас за дэпутата... І вы, каму споўнілася 18 гадоў, пойдзеце на ўчасткі і будзеце галасаваць», — звярнулася да моладзі Старшыня Савета Рэспублікі. На выбарах, у Адзіны дзень галасавання выбаршчыкам трэба будзе выбраць 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 12 514 — мясцовых Саветаў. Потым будуць абраны члены Савета Рэспублікі, а затым сфарміраваны склад Усебеларускага народнага сходу, які ўжо стаў канстытуцыйным органам. Наступны год будзе адметны прэзідэнцкімі выбарамі. Зразумела, што перыяд сапраўды лёсавызначальны і ігнараваць гэтыя падзеі, па сутнасці, тое ж самае, што ігнараваць будучыню сваёй краіны.

Асобна Наталля Качанава адзначыла ролю ў жыцці краіны УНС. Яго члены, агульная колькасць якіх складзе 1200 дэлегатаў, будуць працаваць на працягу пяці гадоў, як і дэпутаты. Усебеларускі народны сход атрымаў надзвычай вялікія паўнамоцтвы, менавіта ён будзе вызначаць стратэгію развіцця дзяржавы і прымаць значныя праграмныя дакументы: Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, Ваенную дактрыну.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Бачыць комплексна, на перспектыву

Наталля Качанава правяла сустрэчу з рэктарамі

УСТАНОВЫ вышэйшай адукацыі павінны выбудоўваць траекторыю свайго развіцця з улікам кадравай патрэбы ў краіне. Аб гэтым заявіла Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля Качанава на сустрэчы з рэктарамі сталічных установ вышэйшай адукацыі.

Спікер нагадала, што на сустрэчы з членамі Рэспубліканскага савета рэктараў установ вышэйшай адукацыі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка абазначыў задачы, якія стаяць перад установамі вышэйшай адукацыі краіны. Тэрмін для вырашэння ўсіх выяўленых у вышэйшай адукацыі праблем устаноўлены 1 верасня 2024 года. Наталля Качанава прапанавала старшыні Рэспубліканскага савета рэктараў Вадзіму Богушу прадставіць наяўныя прапановы і напрацоўкі, каб улічваць іх у далейшай рабоце, у тым ліку пры разглядзе нарматыўных прававых актаў. Па словах спікера, гэта дазволіць прымаць правільныя, абсалютна абгрунтаваныя, выверaныя рашэнні.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што яшчэ на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў установ вышэйшай адукацыі ў ліпені 2023 года з яе ўдзелам ВНУ былі арыентаваны на развіццё з улікам будучых патрэб. Наталля Качанава падкрэслівала, што кіраўнікі павінны дакладна ўяўляць перспектывы кожнай установы вышэйшай адукацыі ў краіне. Паводле яе слоў, важна разумець, наколькі тыя спецыялісты і спецыяльнасці, па якіх вучацца студэнты ў ВНУ, будуць запатрабаваны праз пяць, дзесяць гадоў. І гэта трэба ўлічваць пры ўдасканаленні сістэмы адукацыі — гэта работа праводзіцца ўвесь час.

Гаворачы аб перспектывах, Наталля Качанава адзначыла: «Заўтра іншыя рэаліі, іншыя патрэбы рэальнага сектара эканомікі, гуманітарнай сферы. Мы павінны дакладна гэта разумець». Спікер прапанавала комплексна падумаць над тым, якім будзе развіццё ўстаноў вышэйшай адукацыі, «што сапраўды трэба, што будзе актуальна, запатрабавана». У сувязі з гэтым Старшыня Савета Рэспублікі нагадала аб выязным пасяджэнні экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на базе Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, якое прайшло 15 снежня 2023 года, адзначыўшы, што гэта ўстанова была выбрана невыпадкова. На савеце абмяркоўваліся перспектывы развіцця лёгкай прамысловасці ў Беларусі — гэта галіна ў ліку перспектыўных, якія неабходна развіваць.

«Сёння нашы тавары карыстаюцца попытам у іншых краінах. Але нам патрэбны спецыялісты», — заўважыла спікер. Наталля Качанава нагадала, што Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт некалі быў адзінай ВНУ ў краіне, якая рыхтавала дызайнераў, мадэльераў, спецыялістаў для гарбарнай галіны, абутковай прамысловасці. Гэтая навучальная ўстанова і сёння мае нядрэнную навучальную базу, кваліфікаваныя кадры. Аднак колькасці маладых людзей, якія туды паступаюць, недастаткова для забеспячэння цяперашняй патрэбы эканомікі. «Нам сёння трэба нашмат больш такіх спецыялістаў», — адзначыла яна.

Паводле БелТА.

«У НАС ЦУДОЎНАЯ МАЛАДЗЬ»

«Міжнароднае супрацоўніцтва для нас архіважнае»

Значную частку размовы Старшыня Савета Рэспублікі прысвяціла знешняй палітыцы. «Сітуацыя, што складваецца вакол нашай дзяржавы, архісур'ёзная. Усё, што адбываецца вакол нашых граніц на захадзе, вядома, не можа нас не насцярожваць. Бо гэта гонка ўзбраенняў, нагнятанне істэрыі ў адносінах да нашай краіны. Маўляў, яны — Захад — абараняюцца ад Беларусі і Расіі, сцягваюць зброю і праводзяць манеўры...

Але тысячы, тысячы разоў мы паўтараем: наша дзяржава міралюбівая, мы ніколі нікому не пагражалі. І ніколі нікому не будзем пагражаць. Таму што надта многа нацярпеўся наш народ. Усе войны на нашай зямлі заўсёды былі развязаны не намі і не па нашай волі. Вы гэта ведаеце», — падкрэсліла Наталля Качанава і звярнула ўвагу студэнтаў на тое, што сёлета краіна будзе святкаваць 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таму для ўсіх нас так важна захаваць мір і спакой.

Яна зазначыла, што важная задача парламентарыяў — даносіць да сваіх калег у іншых краінах праўду аб тым, як жыве

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Фота БелТА.

Беларусь. І Савет Рэспублікі актыўна ўдзельнічае ў гэтай рабоце, настойліва даводзіць да сусветнай супольнасці пазіцыю аб непрымальнасці навязвання нам чужой ідэалогіі і канцэптаў. Так, прынята 12 заяў і зваротаў па актуальнай знешнепалітычнай тэматыцы, якія былі накіраваны ў парламенты замежных краін, міжнародныя арганізацыі і апублікаваны ў якасці афіцыйных дакументаў у ААН.

Роўны вучыць роўнага

Гаворачы аб маладзёжнай палітыцы, Наталля Качанава яшчэ раз падкрэсліла важнасць сустрэч прадстаўнікоў улады з моладдзю і існавання маладзёжных арганізацый. Іх удзельнікі не толькі самі атрымліваюць актуальную і карысную інфармацыю, але і перадаюць яе іншым, сваім сябрам, калегам, аднакласнікам. Так, прывадзячы прыклад дзейнасці Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, яна зазначыла: «Для нас вельмі важна, каб яны расказвалі тое, што чуюць ад нас. Словы "роўны вучыць роўнага" аб многім гавораць».

Згадала Старшыня Савета Рэспублікі і адносіны моладзі да традыцыйных каштоўнасцяў, у прыватнасці сямейных. Наталля Качанава зазначыла, што каштоўнасці, якія дамінуюць на Захадзе, для нас непрымальныя. Нашы традыцыі — сям'ю ствараць, дзяцей выхоўваць. Таксама яна запэўніла студэнтаў БДУ, што сям'я ніколі не была і не будзе перашкодай для кар'еры ці для самарэалізацыі. Наадварот, гэта дадатковы стымул імкнуцца да дасягнення сваіх мэт, не гаворачы ўжо пра душэўны спакой і згоду. А дзе, як не ў сямейным коле, можна абмеркаваць пытанні, якія цябе хвалююць? Гэта і ёсць мір і спакой, што ўсім нам трэба зберагчы.

Падводзячы вынікі сустрэчы Наталля Качанава зазначыла: «Я заўсёды з вялізнай радасцю сустракаюся з маладзёжнай аўдыторыяй. І, канешне, мне сёння было вельмі цікава сустрэцца з хлопцамі і дзяўчатамі, гэта ў асноўным першы, другі і трэці курсы. Тыя, хто толькі пачаў вучыцца тут, многія з іх прыехалі з іншых гарадоў, рэгіёнаў. Пры такіх асабістых сустрэчах каторы раз пераконваешся: у нас цудоўная моладзь, якая думае пра будучыню сваёй краіны. Мы ўпэўнены: яны зробяць усё дзеля таго, каб развіваць і прымнажаць тыя традыцыі, якія ёсць у нашай роднай Беларусі».

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

Што цікавіла студэнтаў?

Выбарчая кампанія. Ці мэтазгодна ўвядзенне сістэмы электроннага галасавання ў нашай краіне?.

— Нашы выбары праводзяцца сумленна і адкрыта. Кожны чалавек мае права прыйсці і таемна аддаць свой голас за таго ці іншага кандыдата. І калі пачынаюць казаць пра нейкія фальсіфікацыі, то гэта проста смешна. На мінулай выбарчай кампаніі працавала 70 тысяч чалавек, цяпер будзе каля 50 тысяч людзей ва ўчастковых камісіях, якія ўсе разам будуць лічыць. Як тут сфальсіфікуеш? Ніяк.

Што да электроннага галасавання, то я лічу, што яго ўвядзенне магчымае. Таму што яно зручнае для людзей. Але трэба зрабіць гэта правільна і сумленна, каб гэта не ўшчаміла нікога і каб не дапусціць фальсіфікацый пры галасаванні. Над гэтым пытаннем сёння працуе ЦВК.

Усебеларускі народны сход. Ці магчыма стварэнне маладзёжнай структуры ў рамках УНС?

— Мы гэта не абмяркоўвалі. 1200 дэлегатаў, якія будуць выбірацца, — гэта і моладзь. З ліку дэлегатаў 80 чалавек — прадстаўнікі БРСМ, маладыя людзі. Можна думаць над гэтым, але, на мой погляд, гэта і будзе маладзёжнае крыло.

Мэты ўстойлівага развіцця. Якія з іх выглядаюць найбольш перспектыўнымі для прасоўвання ў маладзёжным асяроддзі і ў Год якасці?

— Мэты ўстойлівага развіцця, якія былі прыняты ААН, вядома, добрыя. Гэта і мір, і стварэнне роўных умоў для жанчын і мужчын, і развіццё моладзі... Але цяпер дасягненне ўсяго гэтага пад вялікім пытаннем. Зневажаюцца ўсе міжнародныя дамоўленасці, нашу краіну на некаторыя мерапрыемствы нават не запрашаюць, а калі і запрашаюць, то ў апошні момант узнікаюць пытанні з візамі і іншае. Пры гэтым мае калегі, Валерый Бельскі і Сяргей Рачкоў, былі ў Нью-Ёрку. На Генеральнай Асамблеі ААН яны выступалі і даносілі праўду: пад пагрозай усё.

Я лічу, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацый можа паставіць тысячы добрых задач, але яны не будуць мець сэнсу, калі адны прыгожа пішуць, а другія — ствараюць перашкоды. Чалавек не будзе думаць ні пра якія пытанні гендарнай роўнасці ці пра развіццё моладзі, калі яму трэба проста выжываць. Таму самае галоўнае, што ўсе мы павінны зрабіць сёння, — гэта забяспечыць мір. А яшчэ — даць магчымасць кожнай краіне развівацца так, як таго жадае яе народ. Тады можна будзе казаць і пра Мэты ўстойлівага развіцця.

Прафесійнае станаўленне. Якія ключавыя моманты, на погляд Старшыні Савета Рэспублікі дапамагаюць у прыняцці рашэння аб прафесійным станаўленні?

— ...Асноўнае для мяне — адказнае стаўленне да ўсяго. Мне ўсюды было камфортна працаваць....

У нашай краіне, калі ты сумленны чалавек і сапраўды добрасумленна ставішся да сваіх абавязкаў, разумееш адказнасць не толькі за сваю сям'ю, але і за краіну, то ўсё магчыма.

Сацыяльныя сеткі. Ці варта ў хуткім часе чакаць персанальнага акаўнта Наталлі Качанавай у сеціве?

— Я думаю, так. Выбары пройдуць, пагляджу, калі застануся — буду ствараць. Не застануся — тым больш буду!

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

АД ЭФЕКТЫЎНАГА ПРАВАСУДДЗЯ ДА ЗАХАВАННЯ БІЯЛАГІЧНАЙ РАЗНАСТАЙНАСЦІ

Сенатары адобрылі пяць законапраектаў

У пачатку чарговага пасяджэння 11-й сесіі Савета Рэспублікі перад парламентарыямі выступіў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Віктар ГУЛЕВІЧ, які расказаў аб асноўных палажэннях новай Ваеннай дактрыны. Плануецца, што сенатары данясуць да шырокай грамадскасці новаўвядзенні гэтага канцэптуальнага дакумента, што ў каторы раз пацвярджае адкрытасць Беларусі ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі.

Калектыўныя іскі і спрошчаная вытворчасць

Пасля выступлення начальніка Генштаба члены Савета Рэспублікі перайшлі да разгляду законапраектаў. Сярод іх — праект Кодэкса грамадзянскага судаводства Рэспублікі Беларусь.

Дакументам замацоўваюцца адзіныя тэрміналогія, правілы падведамаснасці, прадстаўленні доказаў, доказванні, узбуджэнні вытворчасці па справе. Устанаўліваецца агульны трохступеньчаты алгарытм перагляду судовых пастаноў — у судах апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый. Прадугледжваецца магчымасць падачы калектыўных іскаў. Пашыраюцца спосабы прымірэння па справах іскавай вытворчасці, замацоўваецца магчымасць прымірэння па справах, якія ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін. Уводзіцца новы від грамадзянскага судаводства — спрошчаная вытворчасць.

Як адзначыў **старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін СУКАЛА,** з прыняццем законапраекта завяршаецца трэці этап судова-прававой рэформы ў краіне. Ен падкрэсліў, што прынятае кодэкса дасць магчымасць судам усіх узроўняў практычна рэалізоўваць пастаўленыя задачы па павышэнні эфектыўнасці беларускага правасуддзя.

З клопатам аб генетычных рэсурсах і навакольным асяроддзі

Законапраектам «Аб абыходжанні з генетычнымі рэсурсамі», адобраным сенатарамі, замацоўваюцца паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы, урада, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Нацыянальнай акадэміі навук у галіне абыходжання з генетычнымі рэсурсамі. Прапануюцца спрошчаныя меры прадастаўлення доступу да генетычных рэсурсаў раслін для вытворчасці прадуктаў харчавання і вядзення сельскай гаспадаркі пры выкарыстанні такіх генетычных рэсурсаў у некамерцыйных даследчых мэтах. Таксама ўстанаўліваюцца правы і абавязкі пастаўшчыкоў, карыстальнікаў, іншых фізічных і юрыдычных асоб у галіне абыходжання з генетычнымі рэсурсамі. Вызначаецца парадак правядзення манітарынгу ў галіне абыходжання з генетычнымі рэсурсамі і выкарыстання яго даных.

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА,** законапраект новы і вельмі неабходны для нашай краіны. «Гэта наша багацце, наш генетычны рэсурс, банкі створаны, імі трэба клапаціцца, ахоўваць іх, даражыць імі, — удакладніў сенатар. — Мяркуем, што прынятае законапраекта «Аб абыходжанні з генетычнымі рэсурсамі» дазволіць устанавіць прававыя асновы дзяржаўнага рэгулявання ў галіне абыходжання з генетычнымі рэсурсамі і звязанымі з імі традыцыйнымі ведамі, будзе садзейнічаць захаванню біялагічнай разнастайнасці нашай краіны, здароўя людзей і ўмацаванню харчовай бяспекі дзяржавы».

У інтарэсах як вытворцаў, так і спажыўцоў

Разгледжаны законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання». Дакументам удасканальваюцца прававыя і арганізацыйныя асновы дзяржаўнага рэгулявання ў сферы гандлю і грамадскага харчавання. Прадугледжаны меры, накіраваныя на абарону інтарэсаў спажыўцоў і вытворцаў, уніфікацыю патрабаванняў да арганізацыі і ажыццяўлення гандлёвай дзейнасці ў Саюзнай дзяржаве.

У прыватнасці, замацоўваюцца паўнамоцтвы урада па вызначэнні парадку разлікаў за пастаўкі асобных відаў тавараў, а таксама па ўвядзенні абмежаванняў і забарон на прадастаўленне пастаўшчыкамі, суб'ектамі гандлю любых відаў узнагарод. Устанаўліваюцца забароны на кампенсацыю пастаўшчыкамі затрат, звязаных з утылізацыяй (знішчэннем) нерэалізаваных тавараў, а таксама на вяртанне суб'ектамі гандлю нерэалізаваных харчовых тавараў, тэрмін прыдатнасці на якія складае не больш як 30 дзён, іх пастаўшчыкам (вытворцам). Выключаецца абавязак суб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання прадстаўляць у мясцовыя органы ўлады апавяшчэнне аб пачатку ажыццяўлення аптовага, рознічнага гандлю, грамадскага харчавання, а таксама ўзгадняць з мясцовымі органамі ўлады рэжым працы гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання ў начны час (за выключэннем работы ў начны час пры рэалізацыі алкагольных, слабаалкагольных напояў і піва).

***

У завяршэнні пасяджэння сесіі **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** настроіла сенатараў на плённую працу, не збаўляючы тэмпаў. Таксама спікер нагадала аб праве членаў Савета Рэспублікі ў любы час наведваць участкі для галасавання, на якіх будуць выбіраць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў. «Таму і ў адзіны дзень галасавання, і пры датэрміновым галасаванні прыйдзіце і на свае вочы паназірайце за выбарчым працэсам, каб потым даць аб'ектыўную ацэнку, — паставіла задачу Старшыня Савета Рэспублікі. — Каб у нашых злоснікаў і нядобразычліўцаў не было падстаў нас у нечым папракнуць. Мы павінны рабіць сваю справу дакладна, як мы гэта ўмеем, па-сапраўднаму. На карысць нашай краіны і на карысць нашага народа».

Вераніка КАНЮТА.

НА ВЫШЫНІ ПАЛЁТУ

УЗОРНАЯ цыркавая студыя «Фантазёры» з Оршы добра вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Амаль за дваццаць гадоў існавання яе юныя выхаванцы заваявалі сотні высокіх узнагарод. А цяпер з дапамогай Савета Рэспублікі скарбонка дасягненняў у аршанцаў папоўніцца яшчэ больш.

У 2005 годзе ў Оршы на базе ГЦК «Перамога» было вырашана адкрыць цыркавую студыю, у якой маглі б займацца дзеці. Яе стваральнікам стала экс-спартсменка, былая артыстка цырка Святлана Раўкоўская, якая амаль дваццаць гадоў дапамагае юным выхаванцам асвойваць такое нялёгкае, але вельмі захапляльнае мастацтва. Яе выхаванцы цяпер — а гэта каля 30 чалавек — займаюцца акрабатыкай, паветранай гімнастыкай, эквілібрыстыкай, жанглiраваннем і дрэсурай. Выхаванцы студыі «Фантазёры» — актыўныя ўдзельнікі фестываляў у Беларусі і за яе межамі. У цэлым заняткі ў студыі за 19 гадоў сталі для аршанскай дзятвы адным з нямногіх месцаў, дзе можна было развівацца і займацца творчасцю.

Цыркавое мастацтва — справа не толькі нялёгкая, але і такая, што патрабуе значных фінансавых укладанняў. Штосьці са сродкаў вылучала кіраўніцтва гарадскога цэнтра культуры, астатняе набывалі бацькі — абсталяванне для заняткаў, рэквізіт, касцюмы (апошнія, як вядома, каштуюць зусім нямала). Паміж Святланай Андрэеўнай і ГЦК не аднойчы ўзнікалі канфлікты. У 2019 годзе выхаванка цыркавой студыі Паліна Балашэнка прывезла ў Оршу рэспубліканскую ўзнагароду — пяцікласніца стала пераможцай чацвёртага сезона тэлепраекта АНТ «Талент краіны». Але рыхтаваць Паліну да «Таленту краіны» кіраўніку студыі прыйшлося на асабістым энтузіязме — Святлане не падоўжылі кантракт, а памяшканне, у якім дагэтуль займаліся дзеці, прыйшло ў аварыйны стан. Да конкурсу рыхтаваліся ў арэндным памяшканні школы.

Цяпер студыя знаходзіцца ў структуры ДУК «Аршанскі РЦК», юным талентам далі новае асобнае памяшканне, рамонт у якім, дарэчы, зрабілі толькі пасля зваротаў Святланы Раўкоўскай і бацькоў у адну з рэспубліканскіх газет. «Цыркавое мастацтва ў Оршы развіта, пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца нашы шматлікія ўзнагароды рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Але развіта яно на ўзроўні самадзейнасці», — расказвае Святлана Андрэеўна.

У ліку тых, хто неаднойчы прывозіў на Аршаншчыну высокія ўзнагароды, — дачка кіраўніка студыі Дар'я Башкова, якая ўсё жыццё па прыкладзе і пад кіраўніцтвам маці аддала цыркавому мастацтву. Дзяўчына скончыла Кіеўскую муніцыпальную акадэмію і хацела афіцыйна працаўладкавацца ў студыю «Фантазёры». Аднак кіраўніцтва Аршанскага раённага цэнтра культуры дало адказ, што гэты дыплом у нашай краіне не каціруецца.

«Менавіта таму я вырашыла паехаць на прыём да Наталлі Іванаўны Качанавай, бо не ведала, дзе яшчэ прасіць дапамогі. Акрамя асабістай праблемы, агучыла і праблему студыі: нам доўгія гады не хапала лябёдкі для паветраных нумароў і акрабатычнай сцежкі для заняткаў у партэры. Зразумела, што гэта абсталяванне патрабуе нямалых фінансавых укладанняў, але на сцежку мы самастойна сабралі грошы са спектакляў, выйграных грантаў», — успамінае кіраўнік студыі.

Пасля звароту да Старшыні Савета Рэспублікі праблемы нарэшце вырашыліся. Дыплом Дар'і прызналі, дзяўчыну працаўладкавалі ў «Фантазёры». З'явілася ў юных выхаванцаў лябёдка і вымучаная з пятай спробы акрабатычная сцежка. Аб гэтым абсталяванні, прызнаецца Святлана Андрэеўна, яна магла толькі марыць, і дагэтуль яна ўдзячная Наталлі Іванаўне. Ёсць у «Фантазёраў» яшчэ адна мара — пашырыць купал, бо цяпер у зале, дзе займаюцца дзеці, не хапае вышыні для паветраных заняткаў...

Нягледзячы на тое, што цяпер у цыркавой студыі няма замежных гастроляў, бадзёры настрой і жаданне дарыць творчасць людзям у аршанцаў засталіся. На мінулым тыдні на адкрытым Рэспубліканскім фестывалі-конкурсе гімнастыкі і цыркавога мастацтва «Арэна Star» юныя артысты заваявалі тры сярэбраныя медалі, чатыры залатыя і ўзялі гран-пры. Цяпер «Фантазёры» заваёўваюць сэрцы журы ў Санкт-Пецярбургу.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота Узорнай цыркавой студыі «Фантазёры».

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

ФОРУМЫ МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭННЯ

У Ляхавіцкім раёне сельскія сходы праходзяць у пашыраным фармаце

РАНЕЙ сельскія сходы ў Ляхавіцкім раёне праводзілі сельвыканкамы. На іх, як правіла, збіраліся жыхары адной вёскі, абмяркоўвалі надзённыя праблемы, задавалі пытанні кіраўніцтву мясцовай улады. З 2021 года сходы праходзяць у новым фармаце. Яны сталі больш прадстаўнічымі, і ўяўляюць сабой сапраўдны дыялог раённай і мясцовай улады з жыхарамі вёсак.

Як расказаў **старшыня Ляхавіцкага раённага Савета дэпутатаў Юрый ЧАРАНКЕВІЧ,** цяпер на сход у кожны сельсавет выязджаюць старшыня райвыканкама і ўсе яго намеснікі, кіраўнікі асноўных аддзелаў выканкама, кіраўнікі шэрагу раённых службаў. Усяго ў прызначаны дзень у вёску прыбывае каля дваццаці чалавек з раёна. Адказы на пытанні па дарожным будаўніцтве, жыллёва-камунальнай гаспадарцы, медыцынскім абслугоўванні, іншых надзённых праблемах людзі атрымліваюць з першых вуснаў.

Гэты дзень таксама становіцца днём інфармавання грамадзян на тэму жыцця раёна. Кароткае паведамленне пра становішча на тэрыторыі сельсавета робіць кіраўнік сельвыканкама. Затым выступае кіраўнік сельгаспрадпрыемства. А потым пачынаецца дыялог. Людзі агучваюць свае праблемы, пажаданні, прапановы. Кампетэнтныя спецыялісты даюць адказы.

— Так было, напрыклад, у Ганчароўскім сельсавеце — працягвае Юрый Міхайлавіч. — Жыхары вёсак Тальмінавічы, Ганчары, Мядзведзічы, Куршынавічы і іншых населеных пунктаў сабраліся ў Тальмінавіцкім Доме культуры. Усяго на тэрыторыі сельсавета — 24 населеныя пункты з насельніцтвам 1300 чалавек. Прыйшло даволі шмат людзей. Напачатку выступіў старшыня сельскага Савета Уладзімір Плескацэвіч. Ён расказаў, што зроблена за год, спыніўся на выкананні даручэнняў, якія былі сфармуляваны паводле вынікаў мінулага сходу. Напрыклад, праведзена рэканструкцыя лініі электрапередачы ў Тальмінавічах, зараз такая работа вядзецца ў Ганчарах. Апошняе асабліва актуальна, амаль восем дзясяткаў гаспадароў — у спісах на правядзенне электраацяплення.

Яшчэ адным добрым вынікам года стала асфальтаванне дарогі Мядзведзічы — Куршынавічы працягласцю пяць кіламетраў. А на тыя дарогі, дзе не праведзены рамонт, людзі падрабязна ўказалі дарожным службам. Прагучала яшчэ шмат пытанняў пра вясновыя затапленні, пра неабходнасць новых інжынерных камунікацый у асобных населеных пунктах, пра гандлёвае і медыцынскае абслугоўванне. І на ўсе пытанні былі дадзены разгорнутыя адказы. Напрыклад, вяскоўцы цікавіліся, наколькі праўдзівыя чуткі пра тое, што хутка закрыюць магазін у Мядзведзічах. Старшыня райспажыўтаварыства гэтыя чуткі развеяў, сказаў, каб людзі не хвяляваліся, ніхто не збіраецца закрываць стацыянарную гандлёвую кропку.

Жыхары Тальмінавічаў не прамінулі выказаць падзяку за адкрыццё на іх тэрыторыі магазіна сельгаспрадпрыемства «Жарабковічы». І тут жа вылучылі прапанову не спыняцца на дасягнутым, адкрыць у вёсцы кавярню з банкетнай залай.

Паводле слоў Юрыя Чаранкевіча, услед за Ганчароўскім прайшлі сходы для жыхароў Жарабковіцкага, Навасёлкаўскага, Востраўскага, Канькоўскага сельсаветаў. За імі — тры астатнія. Такім чынам, за два тыдні кіраўніцтва раёна сустрэлася з жыхарамі кожнага сельсавета. Як паказвае практыка, найбольш людзей хвалююць стан дарог, пытанні эксплуатацыі жыллёвага фонду, якасць пітной вады, медыцынскае абслугоўванне. Зараз актуальнасць набывае электраацяпленне дамоў, таму даводзіцца інфармаваць грамадзян аб паслядоўнасці работы па мадэрнізацыі ліній электрапередачы як галоўнай умове ўстаноўкі такой формы ацяплення.

Бываюць і нетыповыя просьбы, да якіх кампетэнтныя спецыялісты стараюцца падысці з разуменнем. Скажам, на адным са сходаў адзінокая сталая жанчына папрасіла дапамагчы знесці старое дрэва на ўчастку. Згодна з законам, раслiннасць на прыватнай сядзібе, нават аварыйная, — клопат самога грамадзяніна. Сельсавет не можа прафінансаваць падобную работу з мясцовага бюджэту. Але ж, улічыўшы матэрыяльнае становішча і ўзрост канкрэтнага чалавека, дырэктар ЖКГ паабяцаў дапамагчы жанчыне, калі тэхніка гаспадаркі будзе працаваць у яе вёсцы. Гаспадыні застанецца паклапаціцца пра прыборку галін і ўчастка пасля таго, як дрэва спілуюць. На адным са сходаў узнікла пытанне навядзення парадку ў прыбярэжнай зоне вёскі. Дамовіліся зрабіць гэта на суботніку разам, райвыканкам узяўся паспрыяць з тэхнікай.

— Такая форма камунікацыі з насельніцтвам мае высокі каэфіцыент карыснага дзеяння, — гаворыць старшыня райсавета. — Пасля сходу фармулююцца даручэнні розным службам і падраздзяленням райвыканкама. А яшчэ спрацоўвае фактар публічнасці: абяцанне, дадзенае любой службовай асобай у прысутнасці многіх людзей, як правіла, выконваецца. Ды і вяскоўцы год ад году дэманструюць рост прававой культуры, разумення праблем. На штогадовых сустрэчах мы назіраем, як мяняецца ўспрыманне той ці іншай інфармацыі грамадой. Людзі бачаць, што дадзеныя раней абяцанні выконваюцца, а пустых слоў у такой аўдыторыі не прамаўляюць. І нават калі гаворыцца, што будаўніцтва таго ці іншага ўчастка дарогі ў найбліжэйшай перспектыве не прадугледжана, цяпер не выказваецца калектыўнае абурэнне, як здаралася раней. Людзям тлумачаць прычыны, расказваюць рэальнае становішча, і яны разумеюць, пагаджаюцца.

На сходы прыходзяць усе зацікаўленыя грамадзяне, інфармаванне наладжана даволі добра: праз раённую газету, сацсеткі; таксама вывешваюцца аб'явы ў вёсках каля магазінаў і сельсаветаў. Так што кожны, хто жадае, можа прыйсці на сход, задаць пытанне, выслухаць адказ, атрымаць інфармацыю па самых розных тэмах. Скажам, на кожным са сходаў сёлета прадстаўнік праваахоўных органаў яшчэ раз нагадваў аб бяспецы банкаўскіх карт, аб правілах паводзін, захаванне якіх дапаможа не трапіць у пастку махляроў і прайдзісветаў, ад якіх, на жаль, ужо пацярпелі жыхары раёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з тэлеграм-канала «Новости Ляховичи — Ляхавіцкі веснік».

ПАДТРЫМАЦЬ СЕМ'І, ВЯРНУЦЬ СПАКОЙ ПЕНСІЯНЕРУ І ПАДАРЫЦЬ РАДАСЦЬ ДЗЕЦЯМ

У пошуках вырашэння набалелага пытання людзі вельмі часта звяртаюцца па дапамогу да парламентарыяў. Сваімі жыццёвымі гісторыямі, калі водгук на просьбы аб дапамозе не прымусіў сябе чакаць, з карэспандэнтам «Звязды» падзяліліся жыхары Гомельшчыны. Пасля агучвання праблемы на самым высокім узроўні хвалюючыя сітуацыі гэтых людзей зрушыліся з месца.

Надзея на выздараўленне

Шматдзетная мама Марына Чыкіна — адна з тых, хто шукаў дапамогі ў вырашэнні сваёй складанай жыццёвай сітуацыі падчас правядзення адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі ў Гомельскай вобласці.

Гамяльчанка і яе муж выхоўваюць дзіця-інваліда. Іх дачцэ Настассі 8 гадоў. Тры гады таму ў дзяўчынкі выявілі рэдкае генетычнае захворванне, якое выклікае збоі імуннай сістэмы. Малой жыццёва неабходныя дарагія лекі.

— Больш за 20 тысяч рублёў каштуе адзін укол прэпарату, а яго трэба рабіць кожныя восем тыдняў, — тлумачыць мама дзяўчынкі.

У сям'і Чыкіных трое дзяцей. Бацькі ніяк не маглі самастойна набываць дарагія лекі.

— Спачатку нам дапамог дабрачынны фонд. Але прэпарат закупілі толькі на год, — кажа Марына Чыкіна. — Мы былі вымушаныя прасіць дапамогі і звярнуліся ў Савет Рэспублікі, а паралельна і ў Міністэрства аховы здароўя. Нам адказалі, што міністэрства будзе імкнуцца заключыць дагавор на пастаўку прэпарату ад вытворцы. Летам 2023 года па хадайніцтве Міністэрства аховы здароўя Беларускі дзіцячы фонд закупіў 7 ампул прэпарату. Уводзяць яго дачцэ ў Мінску, адзін укол робяць двум дзеткам, — дадае мама дзяўчынкі.

Марына не можа стрымаць эмоцый, калі згадвае, як ёй патэлефанавалі і пацвердзілі закупку неабходнага для яе дачкі прэпарату.

— Мы так радаваліся ўсе, што цяжка перадаць. Мы ведаем, што гэтыя лекі дапамагаюць дачцэ. Пасля ўводу прэпарату яна радзей хварэе, пачала нарэшце набіраць вагу, расці. Мы памятаем радасць нашай дачушкі, калі пасля першага года лячэння яна змагла выходзіць гуляць на вуліцу. Да гэтага тое было немагчыма, бо малая адразу хварэла, здараліся страшныя прыступы ліхаманкі, тэмпература — больш за 40 градусаў… Таму нам важна не спыняць лячэнне. Урачы робяць добрыя прагнозы, што дачка зможа «выйсці ў рэмісію». Магчыма, нават пойдзе вучыцца ў школу. Цяпер дачка ў трэцім класе на хатнім навучанні, — тлумачыць Марына Чыкіна.

Лекі для Настассі закуплены да лета бягучага года. Сітуацыя сям'і з Гомеля застаецца на кантролі ў Савеце Рэспублікі.

— Мы, вядома, хвалюемся, перажываем, бо вельмі не хочацца, каб дачка зноў вярнулася ў той стан, калі ёй не аказвалася лячэнне. Мы спадзяёмся, што нашу сям'ю не пакінуць сам-насам са складанай сітуацыяй. Не магу выказаць, наколькі важная такая падтрымка сем'ям, дзе дзеці хварэюць на рэдкія захворванні, калі бацькі не могуць ніяк фінансава «пацягнуць» іх лячэнне, — перадае Марына Чыкіна.

Шматдзетная маці не можа не падзяліцца радасцю і ад таго, як дзякуючы звароту ў Савет Рэспублікі іх сям'я неспадзявана для сябе вырашыла і жыллёвае пытанне. У той самы дзень адзінага прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі сенатар Таццяна Рунец даведалася, што сям'я Чыкіных даўно стаіць у чарзе на пашырэнне жылплошчы.

— У нас з мужам на той момант было двое дзяцей-інвалідаў (у старэйшай дачкі інваліднасць нядаўна зняли) і маленькая трэцяя дачушка. Жылі мы ў аднапакаёўцы. Вядома, не маглі нават марыць пра новую кватэру. Прама падчас прыёму сенатара ад кіраўніцтва Адміністрацыі нашага Навабеліцка раёна нам прапанавалі трохпакаёвую кватэру. Гэта сацыяльнае жыллё. Пытанне вырашылі літаральна на працягу тыдня. Мы з мужам зрабілі рамонт і ўжо праз пару месяцаў перасяліліся, — расказвае гамяльчанка.

Святу быць

Ганаровы грамадзянін Мазырскага раёна, член Савета Рэспублікі з 1996 да 2000-га, Вольга Рыгораўна Арцёменка сёння — намеснік старшыні Мазырскага раённага Савета ветэранаў. Іх арганізацыя аб'ядноўвае больш чым 20 тысяч чалавек.

Вольга Арцёменка, член Савета Рэспублікі з 1996 да 2000-га, сёння актыўна прымае ўдзел у рабоце Мазырскага раённага Савета ветэранаў.

— Трэці год праходзіць рэспубліканскі конкурс дзіцячага малюнка «Нам мір завешчана берагчы». Мы ў раёне конкурс актыўна падтрымліваем. Тэма вельмі кранальная, патрыятычная, і юныя мастакі адгукаюцца заўсёды. Прымаюць удзел дзеці розных узроставых груп. Вызначаем пераможцаў у розных намінацыях, якія ўжо далей удзельнічаюць у конкурсе на ўзроўні вобласці, краіны, — распавяла Вольга Арцёменка.

Для пераможцаў конкурсу Мазырскі раённы Савет ветэранаў традыцыйна рыхтуе свята, узнагароджанне дыпломамі і падарункамі. Вольга Рыгораўна звярнулася асабіста да члена Савета Рэспублікі Алега Слінько, каб ён аказаў дапамогу ў арганізацыі і правядзенні раённага этапу рэспубліканскага конкурсу.

— Сенатар асабіста прыехаў на свята да дзяцей, уручыў пераможцам конкурсу дыпломы і падарункі. Мы вельмі ўдзячныя за такую падтрымку, — сказала Ганаровы грамадзянін Мазырскага раёна.

Прапанова, якая змяніла ўсё

Ураджэнец гарадскога пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці Іван Лузай у свой час скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію, атрымаў дыплом зоаінжынера. Пасля выпуску пэўны час працаваў па спецыяльнасці, чатыры гады быў намеснікам дырэктара ў адной з гаспадарак Акцябрскага раёна. Але апошнія гады Іван Іванавіч працаваў вальшчыкам лесу ў лясгасе ў сваім раёне.

— Я працягваў шукаць работу па спецыяльнасці, час ад часу глядзеў аб'явы, прапановы на «біржы» працы. Год таму ўбачыў, што ёсць вакансіі ў гаспадарцы ў Мазырскім раёне, — тлумачыць Іван Лузай. — Вырашыў звярнуцца да кіраўніка «Саўгаса-камбіната «Зара» — сенатара Алега Слінько. Мне адразу прапанавалі на выпрабавальны тэрмін працаўладкавацца на пасаду кіраўніка аддзялення. Пагадзіўся з радасцю, сям'я маё рашэнне падтрымала. Паехаў дадому, звольніўся і прыехаў адразу працаваць.

Іван Іванавіч амаль год як працуе кіраўніком аддзялення № 1 Барбароў «Саўгаса-камбіната «Зара». Яго ўчастак работы — гэта малочнатаварная ферма з дойным статкам на 400 галоў і комплекс па дарошчванні маладняку на амаль тысяч галоў.

— Прайшоў выпрабавальны тэрмін, потым калі ўжо заключылі кантракт, перавёз сям'ю з Акцябрскага. Нам далі службовае жыллё — кватэру ў Мазыры. Жонка таксама знайшла работу, працуе ў дзіцячым садку, — расказвае Іван Іванавіч і прызнаецца: не чакаў, што жыццё яго сям'і так перамяніцца пасля звароту да сенатара.

«Нарэшце змог спакойна заснуць»

Жыхар Мазыра Алег Андрэевіч Філіпкоў таксама шукаў дапамогі ў парламентарыя. Крыху больш за год таму пажылы мужчына аўдавеў. Да гадавіны плануе добраўпарадкаваць пахаванне жонкі, устанавіць помнік. Па паслугу звярнуўся ў прыватную фірму.

— Заключылі дагавор у чэрвені. Унёс перадаплату 2200 рублёў. Я не настойваў, каб рабілі тэрмінова. Мне прапанавалі пазначыць у дагаворы, што тэрмін выканання — 10 верасня, я пагадзіўся, — згадвае Алег Андрэевіч. — У жніўні стаў цікавіцца, калі пачнуць работы на пахаванні, хваляваўся, бо час падыходзіў… Калі звяртаўся, кармілі абяцанкамі, як кажуць. Умяшаўся сын, размаўляў з дырэктарам фірмы. Зноў толькі абяцанні.

Алег Андрэевіч прызнацца: ён настолькі знерваваўся, што наогул страціў надзею, перастаў спаць. Па дапамогу пенсіянер звярнуўся да члена Савета Рэспублікі Алега Слінько.

— Літаральна праз 20 дзён пасля звароту прыватная фірма ўсё выканала, як дамаўляліся. Лічу, што парушаць тэрміны выканання дагавору — гэта не норма. Магчыма, варта пазбаўляць ліцэнзіі такіх прадпрымальнікаў. Таму што, выходзіць, кліент павінен за імі бегаць. Лічу, што ў службах, якія аказваюць паслугі рытуальнага кшталту, павінны працаваць людзі, якія могуць суперажываць, спачуваць, бо іх клиенты, страціўшы блізкіх, і так вельмі моцна перажываюць. І ў такую сітуацыю можа трапіць любы чалавек, — звяртае ўвагу жыхар Мазыра.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота з архіва герояў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.985. **Нумар падпісаны ў 19.30 20 лютага 2024 года.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

ВІЦЕБСК МАСТАЦКІ

Штораз, збіраючыся ў Віцебск, узгадваю сваю даўнюю сустрэчу з мастаком Пятром Явічам (1918–2008), углядаюся ў здымак, які ён падараваў: мастаку пазіруе знакаміты беларускі партызан Мінай Шмыроў...

Ведаю, што ў Пятра Явіча была даўняя мара — пакінуць роднаму гораду напісаныя на працягу многіх дзесяцігоддзяў палотны. Віцебск — сапраўды горад мастакоў і паэтаў...

Пётр Максавіч Явіч, чые творы знаходзяцца не толькі ў музеях і галерэях Беларусі, а яшчэ і ў Траццякоўскай галерэі, — адзін з апошніх вучняў Юдэля Пэна, легендарнага віцебскага жывапісца, які заснаваў у горадзе на Дзвіне адмысловую мастацкую школу. Працавала прыватная школа-майстэрня Пэна ў 1898—1918 гады. Звычайна мастак набіраў ад 10 да 25 дзетак. У праграму заняткаў уваходзілі маляванне з натуры, маляванне геаметрычных прадметаў, арнаментаў і гіпсавых фігур, работа на пленэры. У 1907 і 1914 гадах адбыліся выстаўкі прац Ю. Пэна і яго вучняў. У школе займаліся Заір Азгур, Марк Шагал, Саламон Юдовін, Якаў Мінін... Вучні майстра, без якога нельга ўявіць гісторыю беларускага мастацтва, разышліся па ўсім свеце. І сярод іх першай зоркай, канешне ж, — вядомы ўсяму свету Марк Шагал. Многія віцебскія адрасы канца XIX — пачатку XX стагоддзя звязаны з імем гэтай славутасці. А многія работы Шагала — партрэт Віцебска, няхай сабе і са сваімі прыдумкамі, фантазіямі, усё ж такі партрэт горада, які мы адкрываем і на старых паштоўках. Вядомы нам па іх выявах Віцебск — гэта і Віцебск цэлага атрада мастакоў, якія авалодвалі азамі майстэрства ў мясцовым мастацкім вучылішчы.

У розныя гады яно называлася па-рознаму. Напрыклад, скульптар Заір Азгур паспеў павучыцца і ў Віцебскім мастацка-праектным інстытуце, і ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. А выкладаў тады, у 1920-я, скульптуру ўраджэнец Санкт-Пецярбурга Міхаіл Аркадзьевіч Керзін. Пазней ён пакіне Віцебск, вернецца ўжо ў Ленінград. Але беларускі горад надоўга застанецца ў памяці Керзіна. Як і мастак пакіне ў Віцебску нямала сваіх слядоў. Дарэчы, і званне заслужанага дзеяча мастацтваў Керзіну прысвояць у Беларусі.

Віцебск мастацкі — гэта і лёсы жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сцэнографаў Монаса Манасзона, Мікалая Міхалапа (гэта ён стварыў у Віцебскім тэхнікуме керамічнае аддзяленне ў 1925 годзе), Аляксандра Мазалёва, Залмана Марынгофа, Міхаіла Навумава, Віктара Лук'янава, Міхаіла Міхайлава, Валерыя Лябедзькі, Уладзіміра Напрэнкі, Наталлі Лісоўскай, Валерыя Магучага, Аляксандра Мядзвецкага, Віктара Міхайлоўскага, Яўгена Нікалаева, Альберта Някрасава, Васіля Несцярэнкі, Мікалая Образава, Аляксандра Падалінскага... Безліч імёнаў! Школа магутнага гарту! Не, нават некалькі школ! Пакаленні і пакаленні творцаў, якія прыйшлі ў вялікае мастацтва, пачынаючы з канца XIX стагоддзя, прыйшлі ў першай палове XX стагоддзя, прыйшлі ў 1950—1980-я гады. Па-рознаму склаўся лёс усіх гэтых рупліўцаў. Але кожны, літаральна кожны са згаданых асоб трымаў у полі зроку, у сваім мастацкім светапоглядзе Віцебск. Малюючы сваіх «Плытагонаў», відавочна, думаў пра горад свайго творчага сталення і народны мастак Беларусі Валянцін Волкаў. Ён выкладаў у Віцебску ў 1920-я... У 1925—1930 гадах вучыўся ў мастацкім тэхнікуме яго сын, славуты кніжны графік Анатоль Волкаў. Нелік падчас адной з сустрэч зайшла размова з Сяргеем Анатольевічам Волкавым — сынам і унукам вядомых майстроў, — размова пра Віцебск, яго адметнасць у гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі.

— Нездарма ж і цяпер мастацтвазнаўцы, аглядаючы творчую спадчыну Волкавых, пішуць пра Віцебск, — зазначыў **заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Сяргей Анатольевіч ВОЛКАЎ**. — Вось, калі ласка, цытую з артыкула Наталлі Жоглы: «Нямала графічных работ зрабіў і сын Валянціна Віктаравіча, Анатоль Волкаў. Ён супрацоўнічаў з часопісам «Вожык», вядомы як цікавы плакатыст, ілюстратар. У экспазіцыі можна пазнаёміцца з яго выдатнымі партрэтамі дзяцей. Малюнкі дакладныя, востра схоплены партрэтныя рысы. Моцная школа малявання — спадчына бацькі і вынік навучання ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме, ля вытокаў якога стаяў разам з М. Керзіным і В. Волкаў».

А я дадаю ў нашу размову і тое, што старажытны горад хвалюе і самога Сяргея Волкава як графіка, кніжнага ілюстратара. Мастак пагаджаецца з такой высновай.

У Віцебску ў другой палове 1920-х гадоў працаваў цікавы графік Зіновій Гарбавец. Выкладаў у мастацкім вучылішчы і педагагічным тэхнікуме. Стварыў цыкл гравюр на дрэве, прысвечаных гораду. Вядомыя архітэктурныя пейзажы Зіновія Гарбаўца «Віцебск» і «Вадакачка ў Віцебску», партрэт віцебскага мастацтвазнаўца І. Фурмана. У 1927 годзе пабачыла свет і кніга З. Гарбаўца «Гравюры на дрэве».

Калі ўжо зайшла размова пра 1920-я гады, то згаданы Марк Шагал, які пасля вядомых кастрычніцкіх падзей знаходзіўся пад уплывам рэвалюцыйных пераканняў, стварыў мастацкую школу «новага рэвалюцыйнага ўзору». Яна дзейнічала ў 1919—1923 гады. Існаваў некаторы час пры школе і музей сучаснага мастацтва. Фонд налічваў болей як 120 твораў авангардысцкага характару — работы Д. Бурлюка, П. Канчалоўскага, М. Ларыёнава, Н. Альтмана і іншых майстроў «новай генерацыі». Права на эксперымент, пошукі новага Віцебск адстойваў ва ўсе часы. У 1920–1923 гады дзейнічала арганізацыя «Сцвярджальнікі новага мастацтва». Пройдуць дзесяцігоддзі — і ў Віцебску 1980—1990-х свае новыя праекты будзе рэалізоўваць арыгінальны мастак Аляксандр Дасужаў. Пра змест яго вышукаў гавораць ужо самі назвы палотнаў: «На дзень нараджэння «Квадрата», «ПЛІП 22 (Восеньскае раўнадзенства)», «ПЛІП-аб'ект (Час)», «ПЛІП 252 (Дзень ікс)»...

Развіваючыся з Віцебскам мастацкім, я думаю пра тое, што выдатным праектам узнаўленне гістарычнай памяці мог бы стаць альбом старых паштовак, дзе поруч з выявамі фатаграфічнага кшталту былі б паказаны мастакоўскія ўражанні пра Віцебск пачатку — першай паловы XX стагоддзя. Чаму б і не?..

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава.

Від на цэнтральную частку горада (пач. XX ст.).

Фантан на Губернатарскім бульвары (пач. XX ст.).



Смаленская вуліца і Каменны мост (пач. XX ст.).

Сувенірная паштоўка (пач. XX ст.).

Гарадскі тэатр (пач. XX ст.).

Замкавая вуліца і сабор (пач. XX ст.).

«СТАРАЖЫТНАЯ, ТЫ САМАЯ

Чаго больш для мовы ў іншаземных словах — станоўчага ці небяспекі, ці можна знайсці «залатую сярэдзіну» ў іх выкарыстанні? Напярэдадні Дня роднай мовы, які адзначаецца сёння, мы паразважалі аб гэтым на круглым стале ў рэдакцыі «Звязды». Прыйшлі да нас людзі дасведчаныя, якія вывучаюць мову прафесійна: Ігар КАПЫЛОЎ, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Сяргей ЗЕЛЯНКО, загадчык кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання факультэта журналістыкі БДУ; Алена ЛАПЦЁНАК, загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства; Ірына ЯЛЫНЦАВА, загадчык аддзела беларуска-рускіх моўных сувязяў Інстытута мовазнаўства; Вікторыя УЛАСЕВІЧ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства; Анастасія МАРОЗАВА, навуковы супрацоўнік аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства; Эльвіра ЯРМОЛЕНКА, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства. Наша навукова-папулярная размова атрымалася больш папулярнай, чым навуковай, таму, мяркуем, яна будзе цікавая многім нашым чытачам, якія беларускую мову любяць, шануюць і цікавяцца яе развіццём.

Ігар КАПЫЛОЎ.

Алена ЛАПЦЁНАК.

Сяргей ЗЕЛЯНКО.

Эльвіра ЯРМОЛЕНКА.

«Звязда»: Часта даводзіцца чуць і ад лінгвістаў, і нават ад настаўнікаў тэрмін «засмечванне мовы» — так гавораць, маючы на ўвазе празмернае ўжыванне іншамоўных слоў. Аднак, здаецца, тут у медаля два бакі: на адным з іх — сапраўды недарэчнае ўжыванне чужых слоў, на другім — адсутнасць ва ўласнай лексіцы некаторых паняццяў. І, уласна, нашто прыдумваць аналаг слову «камп'ютар», калі яно ўжо даўно арганічна ўспрымаецца і нават адаптаванае да беларускай мовы з пункту гледжання правапісу...

Ігар Капылоў: Увогуле, калі казаць пра засмечванне мовы, — гэта даволі шырокае паняцце. Гэта і выкарыстанне ненарматыўнай лексікі (цэлая бяда на сёння, асабліва сярод моладзі), жаргоннай лексікі, і, вядома, недарэчнае выкарыстанне іншамоўных слоў. Засмечванне мовы ў гэтым шырокім сэнсе ўвогуле некаторымі мовазнаўцамі разглядаецца як пагроза нацыянальнай культуры. У канцы мінулага года была зацверджана Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця, і мне прыемна адзначыць, што ў ёй надаецца значная ўвага моўнаму аспекту, у тым ліку і экспансіі іншаземных слоў.

Ці трэба спыняць гэту экспансію? Пытанне дыскусійнае. Тут дарэчы гаварыць пра пошук «залатой сярэдзіны», бо на працягу ўсяго існавання беларускай мовы ў ёй з'яўляліся запазычанні. Гэта абсалютна нармальны, натуральны працэс, бо наша грамадства ніколі не жыло ізаляванa — усталёўваліся гандлёва-эканамічныя, знешнепалітычныя, культурныя, навуковыя сувязі з носьбітамі іншых моў, разам з імі з'яўляліся і новыя лексічныя адзінкі, фарміравалася спецыяльная лексіка: навуковая, эканамічная, ваенная... Гэта варта разглядаць як прагрэсіўную з'яву, бо фактычна мова развівалася разам з грамадствам...

Эльвіра Ярмоленка: Запазычанні траплялі ў нашу мову з даўніх часоў. Пранікненню іншамоўных слоў садзейнічалі гандлёвыя сувязі, стасункі з суседнімі краінамі, развіццё навукі і асветы і інш. Напрыклад, з'яўляліся перакладныя творы (рэлігійныя, мастацкія, гістарычныя) — і разам з імі з'яўлялася запазычаная лексіка... Але вось цікавы факт, на які ў свой час звярнуў увагу Аркадзь Жураўскі. У асобных перакладзеных з польскай мовы тэкстах паланізмаў сустракаецца значна менш, чым у некаторых арыгінальных тагачасных беларускіх помніках. Пра што гэта сведчыць? Што нашы продкі вельмі добра адчувалі розніцу паміж запазычанымі словамі і сваімі... Мала таго, яны імкнуліся патлумачыць чытачу іншамоўныя адзінкі. Так, Францыск Скарына размясціў на палях сваіх кніг звыш шасцідзесяці глос, у якіх тлумачыў незразумелыя словы («стакти» — «ладан») і спалучэнні («да насладится» — «приятна будеть»). Аляксандр Булыка выявіў у старабеларускай мове каля чатырох тысяч запазычанняў — і гэта мы гаворым не пра вытворныя ад іх словы, а менавіта пра запазычаныя, якія сваім паходжаннем звязаны больш чым з дзясяткам моў. Іншамоўныя словы сустракаліся ва ўсіх сферах жыцця: гэта былі і грамадска-палітычныя найменні, і сацыяльна-эканамічныя, і ваенныя, і побытавыя, і многія іншыя, у тым ліку і лексіка, што характарызуе чалавека па яго фізічных, псіхічных і інтэлектуальных якасцях. Я магу прывесці некаторыя сучасныя словы, якія ўжо былі ў старабеларускай мове як запазычанні: «акцыза», «капітал», «акцыя», «апеляцыя», «дакумент»...

Ігар Капылоў: Можна нават сказаць, што ў нейкай ступені дзякуючы запазычанням сфарміравалася высокаразвітая мова, здольная абслугоўваць фактычна ўсе сферы жыцця. У пэўным сэнсе ў запазычаннях ёсць вялікі плюс, асабліва для нашай мовы, у якой больш як на два стагоддзі была перарваная пісьмовая традыцыя... Запазычванні ўвогуле адбываліся, калі можна так сказаць, скачкападобна — у залежнасці ад таго, якія ўзрушэнні адбываліся ў той ці іншай сферы жыцця грамадства. Напрыклад, распад Савецкага Саюза выклікаў інтэнсіўнае з'яўленне запазычанай (у першую чаргу англамоўнай) лексікі ў эканамічнай сферы, у сферы інфармацыйных тэхналогій: з'яўляліся новыя прадметы, новыя з'явы, якія трэба было адлюстраваць у мове. Тое самае можна сказаць і пра сферу медыцыны, спорту, культуры і нават побытавую сферу. «Драйвер», «сканер», «сайт» — мы ж не можам без гэтых слоў абысціся ў паўсядзённым жыцці. «Прадзюсар», «фастфуд», «сэлфі», «цюбінг» — гэтыя адзінкі з'явіліся разам з паняццямі, якія яны абазначаюць... Але працэс набраў інтэнсіўнасць, ім пачалі захапляцца, і замест сваіх — натуральных, старажытных — слоў пачалі ўжываць чужыя: не «згода», а «кансэнсус», не «рух», а «драйв», не «выбаршчыкі», а «электарат». Тут ужо аб развіцці мовы гаворка не ідзе, і падобную з'яву станоўчай не назавеш. Можна сказаць, што гэта даніна модзе, і нічога тут не зробіш.

Яшчэ адзін аспект — тэрміналагічны. Да кожнай галіны тэрміналогіі трэба падыходзіць індывідуальна. Медыцынская тэрміналогія ў нас з іншамоўным ухілам, і гэта натуральна. Юрыдычная галіна ў нас таксама з вялікай гісторыяй, таму і ў ёй вялікі працэнт сваіх уласных тэрмінаў. Калі ўзяць сельскагаспадарчую сферу — мы ж сялянская нацыя, таму на большасць назваў тут будуць свае спрадвечныя словы...

«Звязда»: Скептыкі з гэтай нагоды могуць запярэчыць, што самыя што ні на ёсць беларускія словы — не што іншае, як запазычанне з іншых моў. І першай згадаюць «бульбу», якая пайшла ад французскага «bulbe» (клубень)...

Сяргей Зелянко: Сапраўды, многія запазычанні, якія даўно ўвайшлі ў беларускую мову, ужо ўспрымаюцца як уласна беларускія словы. Цікава, што гэтыя словы адрозніваюцца ад рускай мовы, але ўсё роўна не з'яўляюцца ўласна беларускімі. Думаю, што нямногія з тых, хто гаворыць на мове, ведае гэта. «Дзірван», «агурок», «бульба» — яны ж нашы, праўда? Насамрэч гэта даўнія запазычанні.

Вікторыя Уласевіч: Вось сабраліся мы ў аўдыторыі: журналіст, філолагі, скептыкі, аптымісты, якія скончылі школу, універсітэт, працуюць у рэдакцыі, у інстытуце, у акадэміі... Якія з пералічаных слоў — запазычанні? Усе. Гэта засмечванне мовы? Не. Запазычванне — гэта натуральны працэс, так было і так ёсць на сённяшні дзень. Трапляючы ў мову, гэтыя словы перастаюць быць словамі той мовы, з якой прыйшлі, яны становяцца элементамі нашай мовы — у іх з'яўляецца іншая фанетычная афарбоўка, яны падпрадкоўваюцца правілам нашай граматыкі. Заўважце, пра тое, ці трэба ўжываць у беларускай мове даўнія запазычаныя словы, ніхто не спрачаецца, дыскусіі ад мэтазгоднасці выкарыстання выклікаюць толькі новыя запазычанні. Але патрэбны час, каб яны сталі (або не сталі) натуральным элементам мовы. Звычайна толькі моўная практыка здольна паказаць, якія з новых запазычанняў замацуюцца ў слоўнікавым складзе мовы.

Іншамоўныя словы могуць выкарыстоўвацца не толькі для называння новых прадметаў і рэалій, але і быць данінай модзе, з'яўляцца больш сацыяльна прэстыжнымі. Пагадзіцеся, «Я працую ў клінінгавай кампаніі» гучыць больш салідна, чым «Я працую прыбіральшчыцай», хоць размова пра адно і тое ж... Да таго ж нават калі ў запазычанняў ёсць беларускамоўныя адпаведнікі-сінонімы, гэтыя словы ўсё ж маюць свае сэнсавыя нюансы. Вы скажаце «цяжкі падлетак», але не скажаце «цяжкі тынэйджар», праўда? «Крэатыўнасць» і «творчасць» — адно і тое ж? Калі задумацца, дык і не зусім, ёсць розніца. Або калі нам трэба нешта дэталізаваць, запазычанні таксама прыходзяць на дапамогу. Падлетку сёння важна, што ён хоча апрануць: «байку», «худзі» або «світшот».

Сяргей Зелянко: Раней было адно ўніверсальнае слова «кофта». Хоць яно таксама запазычанае...

Вікторыя Уласевіч: Калі ж мода зменіцца, магчыма, і гэтыя словы стануць непатрэбнымі. Мы сёння не можам уявіць жыццё без слова «сэлфі». А з'явіцца новая тэхналогія фатаграфавання, і пра тое ж «сэлфі» ніхто не ўспомніць...

Алена Лапцёнак: ...Як, дарэчы, сёння мала хто з моладзі ведае, што такое «крымплен»... Аналізуючы тлумачальны слоўнік, які складаўся ў другой палове XX стагоддзя, можна знайсці іншамоўныя словы, якія ўжо не ўжываюцца, хоць ў ім яны ацэньваліся як перспектыўныя, напрыклад, многія паняцці з часткай «бія-». Паглядзіце, у які імклівы час мы жывём. Новыя працэсы, з'явы, прадметы з'яўляюцца ў нашым жыцці ледзь не штодня. Зараз, працуючы над новай рэдакцыяй тлумачальнага слоўніка, мы выкарыстоўваем не толькі мастацкія творы, як гэта было раней, мы падключаем мову СМІ, якая хутчэй «ловіць» гэтыя змяненні. І мастацкія тэксты нават адыходзяць на другі план... Пры ўключэнні новых слоў у тлумачальны слоўнік мы звяртаем увагу на іх важнасць на дадзены момант, дастаткова шырокае ўжыванне, іх «стаж» у мове. Як прыклад, слова «брэнд». Спачатку гэта быў выключна эканамічны тэрмін — марка прадукцыі, якая вырабляецца пэўнай кампаніяй. А сёння брэнд — гэта ўжо і кампанія, якая выраблае прадукцыю, і сам тавар, і нават паслугі, і пераноснае значэнне з'явілася: яркі пазнавальны вобраз гасцюці ці чагосьці. Слова жыве, слова развіваецца менавіта ў нашай мове. І хто скажа, што яно не наша? Хоць можа здарыцца, што праз некалькі дзесяцігоддзяў ніхто яго і не згадае..

Эльвіра Ярмоленка: Трэба заўважыць, што некаторыя запазычаныя словы, якія сёння актыўна выкарыстоўваюцца ў мове, мелі раней адрозненне ад сучаснага значэння. Напрыклад, «кантэнт». У старабеларускай мове гэта быў прыметнік са значэннем «задаволены». «Кандыцыя» мела значэнні «ўмова» і «сутнасць», «кампут» — «рахунак», «кампутаваць» — «разлічваць». Было нават вельмі сучаснае слова «манітор» са значэннем «напамінальны». А «калькулятар», калі яшчэ не было прылады з такой назвай, а ўжо тым больш праграмы ў гаджэце, называў рахункавода...

Ігар Капылоў: Трэба сказаць, што некаторыя запазычанні настолькі прыжываюцца, што замяняюць уласнабеларускія словы. Напрыклад, «кветка» і «краска». Якое з іх наша? Зусім не тое, што часцей ужываецца, бо «кветка» — запазычанне з польскай.

«Звязда»: Колькі ўвогуле часу павінна прайсці, каб слова «адаптавалася» і ўжо ўспрымалася, як сваё?

Эльвіра Ярмоленка: Дакладна нельга сказаць. Некаторыя лічаць, што новыя значэнні ў запазычанага слова з'яўляюцца гадоў праз пяцьдзясят...

Ігар Капылоў: Ёсць версія: як толькі ад слова пачалі ўтварацца іншыя формы (напрыклад, ад назоўніка — прыметнік, дзеяслоў), яно ўжо натуральна існуе ў мове.

Сяргей Зелянко: Ёсць яшчэ меркаванне, што век неалагізма — 10-15 гадоў. Але мне падаецца, што гэта ўвогуле вельмі мала.

Вікторыя Уласевіч: Здараецца, што неалагізмы хутка ператвараюцца ў архаізмы, так і не паспеўшы стаць натуральнымі элементамі мовы. Мы доўга спрачаліся, як пісаць слова «пэйджар». Пакуль спрачаліся — не стала неабходнасці: многія ўжо нават не ведаюць, што гэта. Для папярэдняга пакалення «пэйджар», «дыскета», «кампакт-дыск» былі нечым новым, а нашы дзеці ўжо не ўсе ведаюць іх значэнне, бо прадметы, якія яны абазначаюць, проста зніклі з ужытку...

«Звязда»: Напэўна, словы са славянскіх моў прыжываюцца ў нашай лягчэй, чым з іншых?

Анастасія Марозава: Калі казаць пра польскамоўныя словы (а больш правільна — лексічныя сродкі), іх сапраўды значная колькасць. Досыць актыўна яны прыходзілі з польскай мовы (або пры пасярэдніцтве польскай мовы) з канца 80-х–пачатку 90-х гадоў. І сапраўды выглядалі тады моднымі, чаплялі вока, «рэзалі» слых. Але праз 10-15 гадоў яны ўжо не здаваліся такімі новымі свежымі і экзатычнымі. Аналіз паказаў, што многія з гэтых «новых» слоў — зусім і не новыя. Многія з іх ужо адзначаны нават у нашых слоўніках 20-х гадоў XX стагоддзя як адпаведнікі да рускіх, або прыведзены ў шэрагу сінонімаў пры апісанні нейкай з'явы ці нейкага прадмета, асобы. «Ровар», «кіроўца», «мапа», «гарбата» — іх ведалі і нашы бабулі. З «гарбатай» увогуле цікава. Некаторыя лічаць, што так казаць больш па-беларуску, чым «чай». На самай справе абодва словы запазычаныя.

«Звязда»: Іншамоўныя словы, якія ўжываюцца пры наяўнасці беларускіх аналагаў, уласцівыя хутчэй маладзёжнай лексіцы: «хайпаваць», «лайкаць», «хейціць», «чыліць»... Можа, гэта адсутнасць элементарнай моўнай культуры?

Анастасія Марозава: Трэба разумець, што беларускамоўнага слэнгу вельмі мала. У асноўным гэта словы з англійскай мовы, тое ж можна сказаць і пра рускую мову. Сёння сапраўды моднае слова «чыліць». Яно папулярнае, таму што моладзь гэта любіць і час ад часу займаецца. Іх бацькі «адрываліся», яны — «чыляць», а насамрэч і тыя, і другія весела і нязмушана бавілі і бавяць час. У кожнага маладога пакалення свая лексіка, і нічога страшнага ў гэтым няма.

Сяргей Зелянко: Падлеткі парознаму камунікуюць з дарослымі і паміж сабой. Назіраю за сваёй шаснаццацігадовай дачкой — у размове з бацькамі або настаўнікамі яна ніколі не ўжывае тых слэнгавых слоў, якія выкарыстоўвае, калі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СЛАВЯНСКАЯ...»?

Анастасія МАРОЗАВА.

Ірына ЯЛЫНЦАВА.

Вікторыя УЛАСЕВІЧ.

размаўляе са сваімі равеснікамі... Мне падаецца, што гэта проста прыкмета ўзросту, яны перарастуць гэты этап.

Анастасія Марозава: Я таксама не бачу ў гэтым праблемы. Працавала нядаўна з маладой аўдыторыяй і прапанавала ім спачатку напісаць слэнгавыя словы і падабраць да іх агульнаўжывальныя адпаведнікі, а пасля, наадварот, успомніць слэнгавыя варыянты агульнаўжывальных слоў. З першай часткай задання ўсе справіліся лёгка, а вось з другой былі праблемы, хоць даваліся тыя словы, у якіх адпаведнікі на слэнгу дакладна ёсць. Значыць, «нармальнай» мовай наша моладзь валодае добра, а слэнг — сапраўды прыкмета ўзросту...

«Звязда»: Адносна нашай краіны варта мець на ўвазе і становішча білінгвізму, у якім усе мы ад пачатку знаходзімся. Рускія словы, выкарыстаныя ў беларускай мове, здаўна называюць «трасянкай», але ёсць і «трасянка» ў іншы бок — беларускія словы ў рускім маўленні...

Сяргей Зелянко: Раскажу прыклад з уласнай практыкі. Былі з калегам у Маскве на мерапрыемстве і размаўлялі там, натуральна, па-руску. Іншы калега, расіянін, тут жа пазнаў у нас беларусаў. Канешне, ад дзекання і цекання нікуды не падзецца. Але ў нас, як дзіўна ні гучыць, і руская мова, якую рускія не зусім разумеюць. Мы спакойна ў рускім маўленні ўжываем «шуфлядка», «ссобойка», «буська», і нават не здагадваемся, што такія натуральныя для нас у абедзвюх мовах словы для рускіх будуць незразумелымі. Я думаю, што наша «трасянка» — гэта набытак, а не засмечванне мовы, гэта натуральныя працэсы, якія сведчаць аб тым, што мова жывая. Яе, безумоўна, трэба вывучаць і захоўваць.

«Звязда»: Але ж сёння назіраецца іншая з'ява: многія чужыя словы трапляюць у беларускую менавіта праз рускую мову. Выходзіць, яна першая не застрахаваная ад «паразітаў»?

Ірына Ялынцава: Наплыў слоў іншамоўнага паходжання ў рускую мову ў апошнія некалькі дзесяцігоддзяў адзначаюць і многія расійскія даследчыкі. Прычым называюць яго беспрэцэдэнтным, а вядомы лінгвіст Віталь Кастамараў вобразна назваў гэту з'яву не «патокам», а «потопом». Аднак і тут меркаванні раздзяліліся: хтосьці лічыць, што гэта наносіць шкоду мове, але не менш і тых, хто лічыць, што гэта натуральны працэс. У рускай мове многія запазычанні дазволілі ліквідаваць семантычныя прабелы — назваць паняцці, якіх не было. Яшчэ ёсць такое меркаванне, што валоданне носьбітам рускай мовы інтэрнацыянальным лексічным фондам сведчыць аб засваенні ім навукова-тэхнічных дасягненняў сучаснай цывілізацыі. Запазычанні ў некаторых выпадках — гэта яшчэ і зручна: цэлы выраз можна замяніць адным словам: «ритейл» — «розничная торговля», «селфи» — «фотография самого себя», «кофе-брейк» — «короткий перерыв во время научной или бизнес-конференции для приема пищи и неформального общения». Іншая справа, што спрадвечна рускія словы пачалі замяняцца, а то і выцясняцца чужымі недарэчы. «Премия» стала «бонусом», «направление» — «трендом», «предприниматель» — «бизнесменом», «охрана» — «секьюрити», «общение» — «коммуникацией»... Значную і не самую лепшую ролю тут іграюць СМІ, асабліва інтэрнэт.

«Звязда»: А вось у беларускай мове без «камунікацыі» не абысціся. Увогуле гэта галаўны боль беларускамоўных журналістаў, бо аналагу ўніверсальнага рускага «общения» ў нас свайго няма. Можа, варта было б яго прыдумаць?

Алена Лапцёнак: Навукоўцы нейкага новага слова не прыдумаюць. Наша справа — фіксаваць тое, што ў гэтай мове ёсць, апісваць, як словы ўжываюцца ў мове, даваць іх тлумачэнні, выходзячы з гэтага ўжывання... Што датычыцца менавіта гэтага слова, у пэўным кантэксце адпаведнікам будуць «зносіны», дзесьці — «гутарка», а недзе і «камунікацыя». З часам з'явіцца, магчыма, і ўніверсальнае слова, але прыдумаюць яго не філолагі, а простыя носьбіты мовы.

«Звязда»: У Расіі ў XIX стагоддзі спрабавалі зрабіць «исконно русский язык», прыдумаўшы славянскія аналагі ўсім іншаземным словам. Ідэя пацярпела крах...

Ігар Капылоў: І ў XXI стагоддзі такія спробы былі, калі ў Расіі ўступіў у сілу закон аб дзяржаўнай мове. Быў створаны нават камітэт па чысціні мовы, але відавочных вынікаў гэта не дало. Ёсць станоўчы вопыт у мове французскай — там з 1994 года дзейнічае закон, які абавязвае выкарыстоўваць французскія словы, а калі ў запазычанняў няма адпаведнікаў — даваць тлумачэнне словам іншамоўнага паходжання...

Што датычыцца беларускага досведу ў гэтай справе... У адной з медыцынскіх ВНУ з'явіўся слоўнік па медыцынскай тэрміналогіі, дзе іншамоўныя словы замянялі нібыта беларускімі. «Апендыцыт» — «кабылянец», «ключыца» — «раменніца», «мочка» — «блінок», «панос» — «лякса», «пуп» — «жаронак», «энурэз» — «бруй», «эрэкцыя» — «юр» і гэтак далей... З пункту гледжання дыялектолагаў, магчыма, гэта і цікава, бо гэта народная медыцынская тэрміналогія. Але з пункту гледжання ўжывання ў прафесійнай лексіцы ўрачоў — гэта не сумяшчальна, тут павінна ўжывацца інтэрнацыянальная лексіка, яна павінна быць даступнай, агульназразумелай, тым больш што датычыцца здароўя і нават жыцця людзей.

Вікторыя Уласевіч: Замест ужо згаданага «сэлфі» прапаноўвалі казаць «сябешка», замест «смартфон» — «далькажык» (ад «далёка казаць»)... Хоць слова «сеціва» як аналаг «інтэрнэту» прыжылося выдатна... Мы можам толькі меркаваць, але ніколі не скажам дакладна, прыжывецца слова або не. Гэта натуральны працэс, і прагназаванне можа насіць толькі ўмоўны, гіпатэтычны характар.

З іншага боку, лінгвісты могуць адлюстраваць стан мовы на пэўным этапе яе развіцця з дапамогай лексікаграфічных выданняў. У канцы мінулага года выйшаў з друку «Слоўнік новых запазычаных слоў беларускай мовы», укладальнікамі якога былі мы з Наталляй Даўгулевіч. У ім зафіксавана запазычаная лексіка, якая з'явілася ў пачатку XXI стагоддзя і актыўна ўжываецца ў СМІ. Значная частка слоў не была апісана раней і адлюстроўваецца ў слоўніку ўпершыню. Дарэчы, хочацца падзякаваць газеце «Звязда», паколькі з розных прычын большасць ілюстрацыйнага матэрыялу была ўзята менавіта з вашых публікацый.

«Звязда»: Дык ці трэба змагацца за чысціню мовы? Ці ўспрыняць гэта як натуральны працэс развіцця — свайго кшталту сведчанне, што мова не застыла ў сваім развіцці, а значыць, жыве?..

Анастасія Марозава: Усім словам у мове месца знойдзецца, калі яны будуць запатрабаваныя. Мы можам падтрымліваць ужыванне канкрэтных адзінак ва ўласным маўленні, але забараніць іншым або навязаць штосьці не атрымаецца. Усе запазычанні на сёння — элементы лексічнай сістэмы сучаснай беларускай мовы, рэальныя і аб'ектыўныя яе факты, іх паходжанне — справа іншая. І мова дае нам выбар: карыстацца імі або не.

Ірына Ялынцава: Правяду паралель з рускай мовай. Там таксама, як я ўжо казала, хапае запазычанняў, але даследчыкі сыходзяцца ў адным: вялікай катастрофы не адбываецца, гэта натуральны працэс. Што рабіць? Варта проста падымаць моўную культуру. Праблема не ў самой мове, а ў няўмелым валоданні ёю. Працытую расійскага вучонага-лінгвіста Юрыя Караулава: «Тревогу должно вызывать не состояние системы языка, а уровень языковой способности нашего общества — наше массовое косноязычие, производящее впечатление национальной катастрофы». Гэта абсалютна дакладна праецыруецца і на беларускую мову.

Ігар Капылоў: Тут трэба, як ні нечакана гэта прагучыць у кантэксце нашай гутаркі, мець на ўвазе і аспект патрыятычнага выхавання, прадстаўленасці нашай дзяржавы ў вачах турыстаў, міжнароднай супольнасці. У гарадской прасторы, асабліва ў рэгіёнах, назіраецца празмернасць у запазычаных словах у назвах крамаў, аб'ектаў сэрвісу. Магчыма, у гэтым бачацца нейкія маркетынгавыя хады: прыцягнуць увагу наведвальнікаў незвычайнай назвай. Але зусім не горшым, хутчэй, наадварот, маркетынгавым ходам тут сталі б адметныя, цікавыя ўласна беларускія словы.

А «змагацца за чысціню» трэба праз папулярызацыю роднай мовы, пашыраць яе ўжыванне. Чытаць добрыя беларускія кнігі. Калі чалавек добра валодае роднымі словамі, яму не трэба будзе шукаць іншамоўныя адпаведнікі.

Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

КЛЮЧ ДА РАЗУМЕННЯ НАРОДА

Ці папулярная сёння родная мова сярод моладзі, ці будзе ўплываць на яе штучны інтэлект, што варта зрабіць дзеля захавання гэтага нацыянальнага скарбу — вось тыя пытанні, якія былі ўзнятыя ўдзельнікамі прэс-канферэнцыі «Беларускамоўнае асяроддзе. Папулярызацыя роднай мовы».

У МОВЕ ЖЫВЕ ДУША

Сёння беларускімі вучонымі робіцца вельмі шмат для выратавання нацыянальных моўных здабыткаў. Раней ужо былі выдадзены Полацкае і Слуцкае Евангеллі, а зусім нядаўна вернуты яшчэ адзін духоўны сімвал — Жухавіцкае Евангелле. Доўгі час гэты помнік XVI стагоддзя захоўваўся ў бібліятэцы Урублеўскіх у Вільнюсе. Сёння ён стаў даступным і для беларускіх чытачоў. Падрыхтавана не толькі яго факсіміле, але зроблена і навуковае даследаванне, дзе паказана, што моўныя рысы Евангелля сведчаць аб беларускім паходжанні помніка.

На думку **намесніка дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Аляксандра БАРАНОЎСКАГА**, выдатнай крыніцай для вывучэння мовы павінны стаць фальклорныя пісьмовыя (каля чатырох тысяч) і гукавыя (каля 70 тысяч) запісы, сабраныя ў экспедыцыях рознымі пакаленнямі даследчыкаў, якія сёння захоўваюцца ў калекцыі цэнтра. Запісы дазваляюць не толькі больш даведацца пра моўныя працэсы, у іх перадаецца жывая гаворка. Пры іх алічбоўванні можна было б зрабіць цудоўныя гукавыя дадаткі да моўных даведнікаў, папулярызаваць аўтэнтычнае гучанне.

— Захаванне моўнай і культурнай разнастайнасці ў свеце — вельмі важная праблема. Калі знікае якая-небудзь мова — гэта духоўная страта для ўсяго чалавецтва, — упэўнены **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ**. — Кожная мова — ключ да разумення духоўнага пачатку нацыі з шматвяковай культурай, яе знікненне вядзе да страты сувязі паміж пакаленнямі.

Для захавання мовы трэба ўлічваць і патрабаванні часу. Таму вучоныя прычыніліся да стварэння сінтэзатара беларускага маўлення, якраз з выкарыстаннем нейронных сетак. Яго можна выкарыстоўваць у інтэрактыўных даведачных сістэмах, напрыклад у аўтаматах па продажы квіткоў, банкаматах, аўдыягідах, навігатарах, ён будзе карысным і для людзей з парушэннямі зроку.

Запрацавала і так званая «Моўная даведка». З мінулага года можна задаць вучоным Інстытута мовазнаўства пытанні, якія датычацца мовы, і атрымаць анлайн-адказы на сайце ўстановы.

Беларуская мова ўведзена ў такую важную для дзяржавы сферу, як заканадаўчая. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы вучоныя завяршаюць работу па перакладзе кодэксаў на беларускую мову. Дарэчы, 18 кодэксаў ужо перакладзены.

У юбілейны для Інстытута мовазнаўства год запланавана перавыданне граматычных слоўнікаў па ўсіх часцінах мовы. Працягваецца работа над падрыхтоўкай новага Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы ў 15 тамах, аб'ёмам больш за 250 тысяч слоў.

ЗВЯРТАЦЦА ДА КЛАСІКІ

Шмат зроблена і вучонымі Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі. Найперш яны робяць стаўку на класічную спадчыну. Як заўважыў **дырэктар установы Іван САВЕРЧАНКА**, шэдэўры, створаныя геніямі нацыі, мастацкага слова, павінны быць напераздзе. Дзеля гэтага выдаецца серыя «Залатая калекцыя беларускай літаратуры». Ужо выйшла 26 тамоў, для якіх абраныя найлепшыя творы беларускай літаратуры. Візітнай карткай Інстытута літаратуразнаўства з'яўляецца выданне збораў твораў класікаў. Такія праекты сведчаць і пра ўзровень літаратуразнаўчай навукі, і пра высокую філалагічную культуру. Цяпер вучоныя працуюць над зборам твораў Кузьмы Чорнага. Першы том ужо выйшаў, да канца 2025 года будзе падрыхтавана дванаццаць.

Намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар ШНІП расказаў пра сучасныя выдавецкія праекты. Адна з самых запатрабаваных серый — «Бібліятэка беларускай аповесці». Гэта класічныя творы, якія вывучаюцца ў школах. Спадабалася чытачам серыя «Новая бібліятэка беларускай паэзіі». У серыі «Жывая класіка дзецям» рыхтуюцца невялікія добра ілюстраваныя кнігі, а дзякуючы выданням праекта «Сямейнае чытанне» малыя могуць знаёміцца з казкамі і вершамі, на якіх раслі іх бацькі. Да кніжнай выстаўкі-кірмашу, што пройдзе ў сакавіку, рыхтуецца альманах «Першацвет», дзе змешчаны адабраныя ў выніку конкурсу творы дваццаці маладых аўтараў (паэтаў і празаікаў). Гэта ўжо сёмы выпуск, усяго ж, дзякуючы яго выданню, ужо прадстаўлена 140 маладых аўтараў. Вялікую ўвагу папулярызацыі беларускай мовы ўдзяляе і часопіс «Полымя». Сярод цікавых праектаў — публікацыя дзённікаў Уладзіміра Караткевіча, якія раней не друкаваліся, а ў чацвёртым нумары часопіса пабачыць свет невядомая чытачам аповесць класіка.

З РОДНЫМ СЛОВАМ — ДА ЧЫТАЧА

Намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксей ЧАРОТА расказаў, што за мінулы год членамі саюза праведзена звыш 10 тысяч сустрэч з чытачамі па ўсёй краіне. Яны праходзяць у самых розных формах, гэта могуць быць і квэсты, і прэзентацыі, зробленыя з разлікам на розную аўдыторыю. Пісьменнікі прыходзяць у дзіцячыя садкі, школы, ВНУ, сустракаюцца ў бібліятэках з прадстаўнікамі залатога ўзросту. Вялікую ролю для папулярызацыі роднай мовы адыгрывае перакладчыцкая дзейнасць. У выдавецкіх праектах робіцца акцэнт на дзіцячую літаратуру, каб у юнай аўдыторыі выхоўваць любоў да роднай мовы.

Старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі «Акадэміі адукацыі» Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ звярнуў увагу ўдзельнікаў сустрэчы на даследаванне, праведзенае ў канцы 2022 года сярод выпускнікоў установаў агульнай сярэдняй адукацыі. Больш за 90 працэнтаў выпускнікоў назвалі роднай беларускую мову, што сведчыць пра яе запатрабаванасць у маладога пакалення. Беларуская мова становіцца ўсё больш папулярнай, бо ўяўляе сабой своеасаблівы маркер інтэлігентнасці, далучанасці да эліты, а яе вывучэнне — гэта адзін з паказальнікаў патрыятызму і грамадзянскасці.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

